КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
____________ А.І.Жук
« 17 » 04 ____________2025 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1/100/2025/вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

Вучэбная праграма
ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура);
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура. Замежная мова
(з указаннем мовы))

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), зацверджаных 23.02.2023, рэг. № 050 – 2023/у, рэг. № 048 – 2023/у, рэг. № 49 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Н.В.Заяц, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
С.М.Тычына, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.І.Жышкевіч, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 ад 24 сакавіка 2025 г.)

Загадчык кафедры ____________І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 15.04 2025 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнагааддзела БДПУ ____________Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

Вучэбная праграма складаецца з двух раздзелаў: «Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя» і «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». Першы раздзел вучэбнай праграмы дае ўяўленне пра складанасць, шматфарбнасць, рознастылёвасць літаратурнага працэсу першай трэці XX стагоддзя, якому належыць асаблівае месца ў гісторыі нацыянальнага мастацтва ў цэлым і мастацтва слова ў прыватнасці: завяршаецца станаўленне родаў і жанраў літаратуры, фарміруецца беларускі стыль, з'яўляюцца пісьменніцкія індывідуальнасці, здольныя ствараць мастацкія тэксты, што адпавядаюць самым высокім эстэтычным крытэрыям. Другі раздзел вучэбнай праграмы дае ўяўленне пра складанасць літаратурнага працэсу перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, што ўяўляе сабой важны, але неаднародны ў ідэйна-эстэтычных адносінах перыяд. У 40–50-я гады XX стагоддзя раскрыліся новыя грані пісьменніцкіх індывідуальнасцей, якія пачалі сваю дзейнасць у даваенны перыяд, упершыню заявілі пра сябе маладыя аўтары, чыя творчасць стане каштоўным набыткам айчыннай літаратуры і прадвызначыць напрамкі яе развіцця ў наступныя дзесяцігоддзі. Літаратурнае жыццё гэтага перыяду характарызуецца рухомасцю і незакончанасцю працэсаў, адмаўленнем закладзеных папярэднікамі традыцый і вяртаннем да іх, пошукамі новых шляхоў спасціжэння.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта вучэбнай дысцыпліны*: пазнаёміць студэнтаў з этапамі развіцця нацыянальнай літаратуры 20–30-х гадоў XX стагоддзя і асаблівасцямі развіцця нацыянальнай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя; даць уяўленне пра змену мастацка-светапоглядных сістэм, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанравых форм; прааналізаваць жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, змест іх твораў, месца і ролю ў літаратурным працэсе.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

1. фарміраваць сістэму ведаў пра літаратурныя падзеі першай паловы XX стагоддзя, творчыя постаці айчынных пісьменнікаў і іх мастацкую спадчыну;
2. навучыць студэнтаў арыентавацца ў свеце мастацкіх твораў;
3. фарміраваць і развіваць навыкі прафесійнага аналізу літаратурнага тэксту;

4. выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці мастацкіх твораў;

5. выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

Вучэбная праграма складаецца з аглядавых і манаграфічных тэм. У аглядавых даецца агульная характарыстыка 20–30-х гадоў XX стагоддзя, перыядаў Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі ў творчасці пісьменнікаў, раскрываецца ўплыў грамадска-палітычных падзей на літаратуру. Манаграфічна прапануецца вывучаць спадчыну класікаў: Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Жылкі, Уладзіміра Дубоўкі, Язэпа Пушчы, Міхася Зарэцкага, Кандрата Крапівы, Міхася Лынькова, Кузьмы Чорнага, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Івана Мележа, Андрэя Макаёнка, Янкі Брыля і інш.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» адносіцца да модуля «Гісторыя беларускай літаратуры» і ўваходзіць у дзяржаўны кампанент установы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» звязана з вучэбнай дысцыплінай «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX–XX стагоддзяў», якая таксама ўваходзіць у модуль «Гісторыя беларускай літаратуры». Для вывучэння дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» неабходна наяўнасць у навучэнцаў акадэмічных кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Вусная народная творчасць», «Беларуская дзіцячая літаратура», якія ўваходзяць у кампанент установы адукацыі і адносяцца да модуля «Асновы літаратурнай адукацыі».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– шляхі і галоўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры ў гэты перыяд;

– узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры;

– канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў;

– сучасныя ацэнкі мастацкіх з’яў, напісаных у 20–30-я гады XX стагоддзя, перыяды Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя;

– праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці кампазіцыі, вобразна-выяўленчыя сродкі;

– герояў твораў, іх светапоглядныя пазіцыі, рысы характару, месца ў сістэме вобразаў;

– найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў.

**умець:**

– спалучаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных мастацкіх з’яў;

– упісаць літаратурны твор у сацыякультурны кантэкст эпохі;

– вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;

– скласці тэсты па літаратурных творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара;

– каменціраваць мастацкія тэксты, характарызуючы іх з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых аспектаў;

– працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай.

**валодаць:**

– адпаведным паняційным і літаратуразнаўчым апаратам;

– сучаснай метадалогіяй і методыкай літаратуразнаўчых даследаванняў;

– навыкамі разнастайных спосабаў аналізу мастацкіх твораў.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзяў» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступнай кампетэнцыі:

БПК 13. Характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратуры ў аспекце родавай і відавай прыналежнасці мастацкіх твораў, асаблівасцей іх паэтычнай і стылістычнай арганізацыі.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

*Асноўнымі тэхналогіямі навучання з’яўляюцца:* праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; асобасна арыентаваная тэхналогія (улік індывідуальна-асобасных асаблівасцей студэнтаў, захаванне прынцыпу варыятыўнасці); інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання, электронныя бібліятэкі, спецыялізаваныя сайты і інш.).

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 228 гадзін, з іх 120 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 60 гадзін, практычныя заняткі – 60 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 6 заліковых адзінак.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме экзаменаў у V і VI семестрах.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| Семестр | Усяго | Лекцыі | Практычныя | Самастойная работа студэнтаў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| V | 108 | 24 | 24 | 60 | Экзамен |
| VI | 120 | 36 | 36 | 48 | Экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1 «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ 20–30-Х ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ»

### Тэма 1.1. Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў

Актывізацыя культурна-грамадскага жыцця. Палітыка беларусізацыі, яе плённае ўздзеянне на агульны стан нацыянальнай культуры. Уклад у літаратуру пісьменнікаў старэйшага пакалення (творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, З. Бядулі, Ц. Гартнага). Стварэнне літаратурных арганізацый «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», інш. Ідэйна-эстэтычныя праграмы аб'яднанняў: стаўленне да класічнай спадчыны, вуснай народнай творчасці, погляды на месца і ролю літаратуры ў жыцці народа, на выхаванне новага чалавека. «Маладнякоўская» паэзія і проза. Ідэя стварэння новага пралетарскага мастацтва. Пошукі арыгінальных вобразна-выяўленчых сродкаў (паэма М. Грамыкі «Гвалт над формай», вершы А. Александровіча, А. Вольнага, Я. Пушчы, У. Дубоўкі, Т. Кляшторнага, А. Дудара). Жыццесцвярджальны пафас, зварот да новага героя. Узоры прыгодніцкай літаратуры (аповесці «Свінапас» М. Чарота, «Два» А. Вольнага, «Ваўчаняты» А. Вольнага, А. Александровіча, А. Дудара). Сюжэтна-кампазіцыйная блізкасць да «маладнякоўскай» прозы аповесцей Я. Коласа («На прасторах жыцця»), З. Бядулі («Салавей»). Праблемна-тэматычная, жанрава-стылявая шматстайнасць твораў сяброў «Узвышша» (У. Дубоўкі, Я. Пушчы, К. Крапівы, Т. Кляшторнага, М. Лужаніна, К. Чорнага, А. Мрыя, С. Дарожнага). Арыентацыя на нацыянальна адметнае мастацтва. Нерэалізаванасць праграмы аб'яднання ў цэлым, прычыны гэтага. Адносіны былых «нашаніўцаў» і «маладнякоўцаў». Перарастанне барацьбы літаратурнай у палітычную. Рэарганізацыя «Маладняка». Ідэйна-мастацкія арыенціры удзельнікаў «Полымя» (творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, У. Галубка, Ц. Гартнага і інш.). Адыход ад нацыянальных традыцый, цэнтралізацыя літаратурнага жыцця Беларусі: стварэнне БелАПП, Саюза пісьменнікаў БССР.

Пошукі і набыткі паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі. Творчасць У. Хадыкі, В. Каваля, Л. Калюгі, Б. Мікуліча, Я. Нёманскага, П. Галавача, Р. Мурашкі, С. Баранавых, Е. Міровіча, М. Грамыкі, В. Шашалевіча і інш.

### Тэма 1.2. Максім Гарэцкі

Максім Гарэцкі (1893–1938). Біяграфічныя звесткі. Навізна тэматыкі і праблематыкі ранніх твораў (апавяданні «У лазні», «Роднае карэнне», драма «Антон» і інш.). Зборнік прозы «Рунь» у кантэксце нацыянальнага эпасу пачатку ХХ стагоддзя. Вобраз інтэлігента-адраджэнца ў апавяданнях і аповесцях («У чым яго крыўда?», «Меланхолія», інш.). Знешні і ўнутраны

аўтабіяграфізм твораў. Паказ складанага паразумення «вучонага сына» з мацівёскай. Жыццё беларускай вёскі ў аповесці “Ціхая плынь”. Тыповасць лёсу галоўнага героя. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў творы. Падзеі Першай сусветнай вайны ў асэнсаванні М. Гарэцкім («На імперыялістычнай вайне», «Літоўскі хутарок», «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Ціхая плынь», інш.). Гуманістычная пазіцыя аўтара. Творы М. Гарэцкага і пісьменнікаў «страчанага пакалення». Лёс народа, беларуская гісторыя ў прозе першых паслярэвалюцыйных гадоў («Фантазія», «Бітва на Уле», «Апостал», «Дзве душы», інш.). Адыход ад тагачаснай традыцыі ў паказе вобраза камуніста. Раманы «Віленскія камунары», «Камароўская хроніка»: гісторыя напісання, праблематыка, жанравая адметнасць. Цыкл «Сібірскія абразкі». Апошнія творы пісьменніка («Скарбы жыцця», «Лявоніус Задумекус», «Кіпарысы»). Арыгінальнасць жанравай формы. Зварот да прытчы, алегорыі, сімволікі. Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве. М. Гарэцкі – крытык і літаратуразнаўца. «Гісторыя беларускае літаратуры»: лёс кнігі, ацэнкі сучасных даследчыкаў.

## Тэма 1.3. Творчасць пісьменнікаў «Маладняка» і «Узвышша»

### *Падтэма 1.3.1. Андрэй Мрый*

Андрэй Мрый (Андрэй Шашалевіч 1893–1943). Біяграфічныя звесткі. Адметнасць таленту. Апавяданні «ўзвышанскага» перыяду. Нетрадыцыйнасць герояў, асаблівасці мовы твораў. «Запіскі Самсона Самасуя». Гісторыя публікацыі, прачытанне рамана ў 1920-я гады і ў наш час. Самсон Самасуй – чалавек новай грамадскай фармацыі. Тыповасць, універсальнасць адкрытага А. Мрыем вобраза. Грамадская атмасфера канца 1920-х у творы. Шапялёўка і яе ваколіцы – мадэль маладой савецкай дзяржавы. Інтэлігенцыя Шапялёкі: характарыстыка вобразаў другога плана. Жанравая адметнасць рамана, структура і кампазіцыя. Раман А. Мрыя ў кантэксце сатырычнай прозы 1920–1930-х гадоў (творы К. Крапівы, М. Булгакава, М. Зошчанкі, І. Ільфа і Я. Пятрова, А. Платонава, Я. Гашака).

### *Падтэма 1.3.2. Міхась Чарот*

Міхась Чарот (Міхась Кудзелька, 1896–1937). Жыццёвы і творчы шлях. Месца М. Чарота ў літаратурным працэсе 1920-х гадоў. Вызначальныя рысы паэзіі. Вобраз рэвалюцыі ў зборніку «Завіруха». Ліра-эпас пісьменніка. Паэма «Босыя на вогнішчы». Сімволіка вобразаў, розныя трактоўкі «босых». Жанравая разнастайнасць прозы. Гуманістычны пафас твораў пра лёс прадстаўнікоў старога свету («Галя», «Талачка-шкрабалачка»). П’есы для дзяцей. Драма «На Купалле». Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча і Я. Купалы ў камедыі-вадэвілі «Мікітаў лапаць». Апошні верш М. Чарота.

***Падтэма 1.3.3. Уладзімір Жылка***

Уладзімір Жылка (1900–1933). Біяграфічныя звесткі. «Віленскі» і «пражскі» перыяды творчасці. Стасункі з «Маладняком». Гістарычны лёс радзімы, незалежніцкія і адраджэнскія матывы ў творах («Хто мужны, хто смелы, хто дужы...», «Беларусь», інш.). Традыцыі М. Багдановіча ў творчасці У. Жылкі («Меч», «Палімпсест», «Хараство», «Вершы аб Вільні»). Танальнасць філасофскай лірыкі («На ростані», «Бяспынна, глуха процьма часу...», «Усе мы страчаныя...» і інш.). Міні-паэма «Тэстамент» – споведзь і запавет паэта наступным пакаленням. Вобраз аўтара ў творы. У. Жылка – крытык і перакладчык.

***Падтэма 1.3.4. Уладзімір Дубоўка***

Уладзімір Дубоўка (1900–1976). Жыццяпіс. Раннія зборнікі «Строма», «Трысцё», «Credo», іх мастацка-вобразная адметнасць. Выявы «маладнякоўскай бурапеннасці». Стаўленне Дубоўкі-маладнякоўца да класічнай спадчыны. Зварот да ліра-эпасу («Там, дзе кіпарысы», «Плач буры», інш.). У. Дубоўка і М. Багдановіч. Шырокае выкарыстанне фальклору ў творах «узвышанскага» перыяду, смелы пошук новых паэтычных формаў. Тэма мастака і мастацтва ў паэтычнай трылогіі «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!». Сюжэтнае і кампазіцыйнае наватарства паэм. Творы ва ўспрыманні крытыкі 1920-х гадоў і іх сучаснае прачытанне (М. Арочка, В. Максімовіч). Творчасць 1950–1970-х гадоў. Гісторыя напісання зборніка «Палеская рапсодыя». Вобраз Беларусі ў кнізе.

***Падтэма 1.3.5. Міхась Зарэцкі***

Міхась Зарэцкі (Міхась Касянкоў, 1901–1937). Жыццёвы і творчы шлях. Рысы «маладнякоўскай» прозы ў ранніх апавяданнях (зборнікі «У віры жыцця», «Пела вясна»). Абарона агульначалавечых каштоўнасцей (апавяданні «Бель», «Дзіўная», «Адна партыя ў шашкі», «Ворагі», «Кветка пажоўклая», «Двое Жвіроўскіх», «Паэма пра чорныя вочы», «Ой, ляцелі гусі...»). Навізна праблематыкі першых вялікіх эпічных твораў («Голы звер», «Сцежкі-дарожкі»), сюжэтна-кампазіцыйнае майстэрства празаіка. Нарыс «Падарожжа на Новую зямлю», няскончаны раман «Крывічы» ў творчым і чалавечым лёсе пісьменніка. Падзеі калектывізацыі ва ўзнаўленні М. Зарэцкім. Раман «Вязьмо». Віна і бяда Сымона Карызны. Багацце і разнастайнасць чалавечых характараў у рамане. Вобраз Галілея і яго функцыянальная роля ў ідэйным змесце твора. Вобразы жанчын «новага часу». Раман М. Зарэцкага ў кантэксце літаратуры свайго часу пра «вялікі пералом». Тэматыка і праблематыка п’ес «Віхор на балоце», «Белыя ружы». Пытанне пра творчы метад пісьменніка.

***Падтэма 1.3.6. Язэп Пушча***

Язэп Пушча (Іосіф Плашчынскі, 1902–1964). Факты біяграфіі. Творчасць 1920-х гадоў у ацэнцы савецкай крытыкі. Пафас «маладнякоўскіх» зборнікаў «Раніца рыкае», «Vita». Захапленне паэтыкай імажынізму. Выдаткі паэтычнага

эксперыменту. Змена танальнасці ў кнігах «Дні вясны» і «Песні на руінах». Матывы і вобразы цыклаў «Асеннія песні», «Лісты да сабакі». Ідэйна-мастацкія адрозненні паміж «маладнякоўскім» і «ўзвышанскім» перыядамі. Задума стварэння паэмнай трылогіі і яе мастацкае ўвасабленне. Рэалістычны і сімвалічны планы прачытання паэм «Песня вайны», «Цень Консула». Архітэктоніка твораў. Паэма «Сады вятроў». Тэма мастака і мастацтва ў ліра-эпасе Я. Пушчы. Пушча-крытык пра ролю творцы і літаратуры ў грамадскім жыцці (артыкулы «У абарону маладой паэзіі», «Максім Лужанін. Крокі» і інш.). Зборнікі Я. Пушчы 1960-х гадоў «Вершы і паэмы», «Пачатак легенды». Змест ненадрукаваных пры жыцці аўтара вершаў.

## Тэма 1.4. Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гадоў. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі

Маласпрыяльныя ўмовы для творчасці. Падмена сапраўдных мастацкіх каштоўнасцей творамі-аднадзёнкамі, шырокае бытаванне ў літаратуры сацыяльных і ідэалагічных заказаў. Адыход ад рэалістычных традыцый узнаўлення падзей, ідэалізацыя і прыхарошванне як норма ў творчасці. Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Стварэнне адзінага Саюза пісьменнікаў СССР. З’яўленне і афіцыйнае замацаванне ў тэорыі тэрміна сацыялістычны рэалізм. Адкрытае і прыхаванае непрыманне пісьменнікамі таталітарнай улады. Асуджэнне прымусовай калектывізацыі, паспешлівасці ў яе правядзенні (аповесці і раманы Я. Коласа «Адшчапенец», Б. Мікуліча «Чорная Вірня», М. Зарэцкага «Вязьмо», п’есы К. Чорнага «Лета», В. Шашалевіча «Рой»). Адстойванне ідэі даверу да чалавека (камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»). Матывы расчараванасці і смутку ў паэзіі У. Хадыкі, З. Астапенкі, С. Астрэйкі.

## Тэма 1.5. Літаратура Заходняй Беларусі

Мінск і Вільня як два культурныя цэнтры Беларусі. Перадумовы і прычыны гэтага. Папулярнасць ідэі аб’яднання ў абедзвюх частках краіны. Грамадска-палітычнае жыццё на «крэсах усходніх». Этапы нацыянальна-вызваленчага руху. Перыядычныя выданні на беларускай мове. Праца ў драматургіі 1920-х гады Л. Родзевіча і Ф. Аляхновіча. «Віленскі» перыяд у творчасці М. Гарэцкага, У. Жылкі. Асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны, дзяржаўнасці народа публіцыстыкай (артыкулы Б. Тарашкевіча, А. Луцкевіча, А. Смоліча, М. Гарэцкага, Л. Родзевіча і інш.). Літаратурна-філасофскія эсэ І. Абдзіраловіча (І. Канчэўскага) «Адвечным шляхам», Сулімы (У. Самойлы) «Гэтым пераможаш!». Неаднароднасць літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі. Пашырэнне масавай паэзіі, літаратуры факта. Творчасць пісьменнікаў розных культурна-мастацкіх і ідэйных арыентацый, аб’яднаных ідэяй служэння Радзіме (З. Верас, К. Сваяка, Х. Ільяшэвіча, А. Салагуба, М. Васілька,

М. Машары, П. Пестрака і інш.). Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў паэзіі 1930-х гадоў (творчасць М. Танка, М. Машары, М. Засіма, В. Таўлая і інш.).

## РАЗДЗЕЛ 2 «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ПАСЛЯВАЕННАГА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ»

### Тэма 2.1. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны

Тэма будучай вайны ў літаратуры і мастацтве (песні, кнігі, кінафільмы). Асаблівасці раскрыцця тэмы беларускімі аўтарамі (вершы і паэмы П. Панчанкі, А. Куляшова, інш.). Трагедыя 1941-га года. Ваенныя дарогі беларускіх пісьменнікаў. Паэтычны зварот Я. Купалы да свайго народа («Беларускім партызанам»). Перавага лірыкі над іншымі родамі літаратуры. Шырокае бытаванне балады і вершаў баладнага тыпу (творы А. Куляшова, А. Вялюгіна, П. Броўкі, П. Панчанкі і г.д.). Вобраз Беларусі-змагаркі і Беларусі-паланянкі. Абвостранае пачуццё гістарызму, пошукі духоўнай падтрымкі ў мінулым народа («Курганы» П. Панчанкі, «Ты – мая Яраслаўна» К. Кірэенкі і інш.). Зварот да першаасноў народнага жыцця, традыцый і звычаяў беларусаў. Лепшыя ўзоры ваеннай лірыкі («У стоптаным жыце» М. Сурначова, «Герой», «Сінія касачы» П. Панчанкі, «Пасылка» П. Глебкі і інш.). Ліра-эпас ваенных гадоў. Паэмы Я. Коласа «Адплата», «Суд у лесе», А. Куляшова «Сцяг брыгады», «Прыгоды цымбал», П. Броўкі «Паэма пра Смалячкова», «Беларусь», «Ясны кут», М. Танка «Янук Сяліба», А. Бялевіча «Мой майстра», З. Астапенкі «Эдэм». Абумоўленасць тэматыкі, ідэйнага зместу твораў суровым подыхам часу. Паказ гераізму і патрыятызму савецкага чалавека ў прозе (апавяданні К. Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна). Сувязь твораў з жыццёвымі фактамі і падзеямі. Сацыяльна-філасофскія раманы К. Чорнага («««Пошукі будучыні», Млечны шлях», «Вялікі дзень»), іх выключанасць з літаратурнага працэсу 1940-х гадоў.

### Тэма 2.2. Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1946–1956)

Пастановы ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабоце Саюза пісьменнікаў, літаратурна-мастацкіх часопісаў і газет. Сутнасць тэорыі бесканфліктнасці, яе выявы ў драматургіі, прозе, паэзіі.

Паслабленне сувязей паэзіі з жыццём. Ідэалізацыя рэчаіснасці, ілюстрацыйнасць, адрыў лірычнага «я» ад асобы аўтара. Эпізацыя лірыкі. Праблемы мінулай вайны і адбудовы мірнага жыцця ў ліра-эпасе (паэмы П. Броўкі «Хлеб», А. Куляшова «Новае рэчышча», «Толькі ўперад», «Грозная пушча», А. Бялевіча «Сям'я» і інш.). Неглыбокі паказ пасляваеннай рэчаіснасці ў творах. Праца ў літаратуры пісьменнікаў старэйшага пакалення (Я. Коласа,

М. Лынькова). Адлюстраванне гераічнага змагання беларускага народа ў гады вайны ў аповесцях і раманах І. Гурскага («Лясныя салдаты»), У. Краўчанкі («Рыгор Шыбай»), І. Шамякіна («Глыбокая плынь»), А. Кулакоўскага («Расстаёмся ненадоўга»), І. Мележа («Мінскі напрамак»). Імкненне стварыць маштабныя, панарамныя эпічныя палотны. Неглыбокі псіхалагізм твораў. Тэма стваральнай працы ў прозе А. Стаховіча, У. Краўчанкі, М. Паслядовіча, Т. Хадкевіча, А. Кулакоўскага («Пад мірным небам», «Станаўленне», «Цёплае дыханне», «Вяснянка», «Гартаванне» і інш.). Выдаткі твораў. Аповесці і раманы пра мірнае жыццё І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля. Набыткі і страты пасляваеннай драматургіі (п’есы К. Крапівы «З народам», «Пяюць жаваранкі», «Людзі і д’яблы», «Зацікаўленая асоба», А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў», К. Губарэвіча «Брэсцкая крэпасць» і інш.).

Спробы пісьменнікаў выйсці з кола зададзенасці, прыхарошвання, спрашчэння рэчаіснасці (вершы «Слова да паэтаў», «Пісьмо юнака да паэта» П. Панчанкі, паэма «Люцыян Таполя» М. Танка, аповесць «На Быстранцы» Я. Брыля, камедыя «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка).

### Тэма 2.3. Кандрат Крапіва

Кандрат Крапіва (Кандрат Атраховіч, 1896–1991): жыццёвы і творчы шлях. Аб’екты аўтарскага смеху ў ранніх паэтычных і празаічных зборніках. Праблематыка, героі баек, традыцыі народнай смехавой культуры ў творах. Зварот да парадыйнай і сатырычнай паэмы («Біблія», «Шкірута», «Хвядос – Чырвоны нос»). К. Крапіва пра месца сатыры ў жыцці і літаратуры (артыкулы канца 1920–1950-х гадоў). Спроба стварэння рамана «Мядзведзічы». Першыя п’есы пісьменніка («Канец дружбы», «Партызаны»). Месца сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім» у творчай спадчыне К. Крапівы. Гуманістычная ідэя твора, сутнасць канфлікту, вобразы персанажаў. Майстэрства драматурга. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе мастацкае вырашэнне ў драме «Проба агнём». Нетрадыцыйны паказ ваеннай рэчаіснасці ў сатырычнай камедыі «Мілы чалавек». Уплыў тэорыі бесканфліктнасці на лірычную камедыю «Пяюць жаваранкі». «Брама неўміручасці» як філасофскі роздум драматурга над сутнасцю чалавечага існавання. Галерэя сатырычных тыпаў і вобразаў. Роля станоўчых персанажаў у камедыі. Апошнія творы, інтэрв’ю і выступленні народнага пісьменніка.

### Тэма 2.4. Міхась Лынькоў

Міхась Лынькоў (1899–1975): біяграфічныя звесткі. Паказ у ранніх творах (апавяданні «Над Бугам», «Маньчжур», «Баян» і інш.) нараджэння новага чалавека. Тэма Заходняй Беларусі ў творчасці. Адметнасць стылявой манеры М. Лынькова. Праца над раманам «На чырвоных лядах». «Малая» проза ваеннага часу (зборнік «Астап»). Вобразы дзяцей у творах («Васількі»,

«Дзіцячы башмачок» і інш.). Спроба шырокага эпічнага асэнсавання подзвігу народа ў рамане «Векапомныя дні». Багатая падзейная аснова твора, рэальныя прататыпы герояў. Месца рамана ў беларускай ваеннай прозе.

### Тэма 2.5. Кузьма Чорны

Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі, 1900–1944): жыццёвы і творчы шлях. Старонкі «Дзённіка» К. Чорнага пра жыццё ў Маскве і на радзіме. Вобраз пісьменніка ў мастацкай літаратуры. Уплыў Чорнага на творчасць беларускіх празаікаў. Першыя публікацыі. Асаблівасці апавяданняў «маладнякоўскага» і «ўзвышанскага» перыядаў. Творчае крэда пісьменніка – «Чалавек – гэта цэлы свет». Блізкасць першых раманаў «Сястра», «Зямля» да апавяданняў. Задума стварэння цыкла эпічных твораў пра гістарычны шлях народа. Арыгінальнасць мастацкай ідэі. Цікавасць празаіка да філасофскіх праблем. Здзейсненае і няздзейсненае К. Чорным. Тэматыка, праблематыка, мастацкія асаблівасці, цэнтральныя вобразы раманаў «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне», аповесцей «Лявон Бушмар», «Люба Лук'янская». Сучаснае прачытанне «Трэцяга пакалення». Змены ў светапоглядзе пісьменніка ў 1930-я гады. Вяртанне К. Чорнага ў час Вялікай Айчыннай вайны да ідэі складанасці чалавечага свету. Вяршынныя творы пісьменніка – раманы «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень». Асэнсаванне сутнасці і вытокаў фашызму. Месца твораў у нацыянальнай літаратуры пра мінулую вайну. Асаблівасці стылю К. Чорнага.

### Тэма 2.6. Пятрусь Броўка

Пятрусь Броўка (1905–1980): жыццёвы і творчы шлях. Скіраванасць паэта на абстрактна-рытарычную паэзію ў ранніх зборніках. Наследаванне У. Маякоўскаму. Творчая пераарыентацыя пісьменніка (зборнік «Прыход героя»). Адарванасць ад рэалій жыцця многіх твораў 1930-х гадоў (паэма «Кацярына», вершы «Плыві, наша песня, далёка...», «З новым годам» і інш.). Тэндэнцыя да актыўнага самавыяўлення ў творах перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Узрушанасць лёсам роднай зямлі (вершы «Маці», «Роднае», «Надзя-Надзейка», «Спатканне» і інш., паэма-маналог «Беларусь»). Балада ў творчасці П. Броўкі. Прыглушанасць лірычнага пачуцця ў творах першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (зборнікі «Сонечнымі днямі», «Цвёрдымі крокамі», інш.). Спроба напісання рамана «Калі зліваюцца рэкі». Прарывы да асэнсавання агульначалавечых каштоўнасцей (паэма «Голас сэрца», вершы «Александрына», «Пахне чабор», «Калі надыдзе час спачыну…», інш.) і паэтычны гладкапіс у творчасці 1960–1970-х гадоў. Пераацэнка творчай спадчыны П. Броўкі. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны нерэалізаваных магчымасцей мастака.

## Тэма 2.7. Максім Танк

Максім Танк (1912–1995): жыццяпіс. Давераснёўскі перыяд творчасці. Месца М. Танка ў літаратурным працэсе 1930-х гадоў. Лёс зборніка «На этапах». Спробы маладога аўтара выйсці за межы традыцыйнай паэзіі. Жанравая адметнасць ліра-эпасу («Нарач», «Журавінавы цвет», «Сказ пра Вяля» і інш.). Вобразы абаронцаў народа ў творах. М. Танк пра ўз'яднанне Беларусі ў «Лістках календара» і «Дзённіках». Паэзія ваеннага перыяду. Пашырэнне тэматычнага дыяпазону ў зборніках «Каб ведалі», «На камні, жалезе і золаце», «У дарозе». Паэма «Люцыян Таполя» як пратэст супраць несвабоды мастака. Выявы тэорыі бесканфліктнасці ў лірыцы пасляваенных гадоў. Паглыбленне філасофскага пачатку, гуманістычнага пафасу, ускладненне мастацка-вобразнай сістэмы твораў у зборніках «След бліскавіцы», «Мой хлеб надзённы», «Глыток вады», «Дарога, закалыханая жытам» і інш. Тэматыка, праблематыка лірыкі 1980–1990-х гадоў. Сімволіка назваў апошніх кніг «Збор калосся», «Мой каўчэг», «Errata». Вызначальныя рысы паэзіі М. Танка. М. Танк – майстар верлібра.

## Тэма 2.8. Аркадзь Куляшоў

Аркадзь Куляшоў (1914–1978): факты жыцця і творчасці. Даніна «маладнякізму» і рытарычнасці ў зборніках «Росквіт зямлі», «Па песню, па сонца!..», «Медзі дождж». Праблематыка нізак вершаў «Маім аднагодкам», «Сонечнае заўтра», «Юнацкі свет». Пошукі новай паэмнай формы ў творах «Крыўда», «Аманал», «Гарбун». Паэма-прадбачанне «Хлопцы апошняй вайны». Гісторыя напісання твораў «Сцяг брыгады», «Балада аб чатырох заложніках», «Ліст з палону». Зварот да трагедыйных аспектаў народнага жыцця. Сучаснае прачытанне паэмы «Сцяг брыгады», вершаў «Камуністы», «Інтэрнацыянал». «Новая кніга» як адмаўленне ад ілюстрацыйнасці паэзіі 1950-х гадоў. Паварот да філасофскага асэнсавання жыцця. «Касмічная» нізка вершаў («Адвечны час з нябачных нам дарог…», «Ты згасіш сонца, час, але не згіне…» і інш.). Асэнсаванне катэгорый Часу, Вечнасці, Жыцця, Смерці ў вершах 1960–1970-х гадоў. Тэма паэта і паэзіі, шматаспектнасць яе вырашэння ў вершах і паэмах. Шматстайнасць жанравых форм ліра-эпасу («Маналог», «Цунамі», «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях», «Хамуціус»). Роздум у творах над лёсам чалавека, народа, чалавечай цывілізацыі. А. Куляшоў – перакладчык.

## Тэма 2.9. Пімен Панчанка

Пімен Панчанка (1917–1995): жыццёвы і творчы шлях. Адметныя рысы творчасці 1930-х гадоў («Падсочка», «Выязджалі лесарубы», «Адкопаныя зарніцы», інш.). Уплыў М. Лермантава. Творчасць гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Цыкл «Іранскі дзённік». Паэма «Маладосць у паходзе» як завяршэнне ваеннага перыяду. Імкненне паэта ўзняцца над беспраблемнасцю, гладкапісам

літаратуры першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Рэаліі замежнага жыцця ў зборніках 1950–1960-х гадоў. Шырокі тэматычны дыяпазон лірыкі. Зварот да сатыры («Прыстасаванцы», «Трэснула, грукнула...», «Бацька», «Здарэнне ў гасцях», інш.). Роздум пісьменніка над лёсам народа, роднай зямлі, мовы, над наступствамі Чарнобыля, бездухоўнасцю ў творах 1970–1990-х гадоў. Узмацненне сатырычнага пачатку на апошнім этапе творчасці. Матывы расчаравання і пакаяння ў зборніках «І вера, і вернасць, і вечнасць», «Горкі жолуд», «Высокі бераг», «Зямля ў мяне адна». Тэматычная і жанравая разнастайнасць лірыкі, пафасны поліфанізм, напоўненасць сродкамі мастацкай выразнасці. Верш-некралог Р. Барадуліна «Пімену Панчанку».

**Тэма 2.10. Янка Брыль**

Янка Брыль (1917–2006): факты жыцця і творчасці. Эпічная і лірычная плыні ў ранніх творах. Класічныя апавяданні 1950-х гадоў («Маці», «Memento mori», «Галя», «Надпіс на зрубе»). Адметныя рысы Брыля-апавядальніка. Лірычная проза пісьменніка (апавяданні «Як маленькі», «Тройчы пра адзіноту», «Яшчэ раз першы снег», інш.). Зварот да малых жанравых форм апавядання – замалёўкі, абразка, мініяцюры (кнігі «Жменя сонечных промняў», «Ты жывеш», «Сёння і памяць», «Вячэрняе», інш.). Асоба аўтара ў творах. Вялікія жанравыя формы ў творчасці Я. Брыля. Праца над раманам «Граніца». Тэматыка і праблематыка аповесцей «У Забалоцці днее», «На Быстранцы», «Ніжнія Байдуны». Творчая гісторыя рамана «Птушкі і гнёзды». Жанрава-стылявыя асаблівасці, аўтабіяграфізм твора. Духоўнае сталенне Алеся Руневіча. Паказ трагедыі нямецкага народа. Роздум аўтара над лёсам свайго народа. «Сямейная сага» – аповесць «Муштук і папка». Тэма дзяцінства ў творах Я. Брыля («Золак, убачаны здалёк», «Гуртавое», «Птушкі і гнёзды», інш.).

**Тэма 2.11. Андрэй Макаёнак**

Андрэй Макаёнак (1920–1982): жыццёвая біяграфія. Камедыя «Выбачайце, калі ласка!»: надзённасць праблематыкі, адметнасць чалавечых характараў, разнастайнасць мастацкіх прыёмаў і сродкаў. Месца твора ў літаратуры 1950-х гадоў. Жыццё калгаснай вёскі ў п’есах «Каб людзі не журыліся», «Лявоніха на арбіце», «Таблетку пад язык». Змена танальнасці ў творах. Тэматычнае і жанравае наватарства п’ес. Зварот драматурга да трагікамедыі. Выкарыстанне сродкаў тэатральнай умоўнасці, элементаў фантастыкі, падтэксту («Зацюканы апостал», «Кашмар», «Дыхайце эканомна!..»). Арыгінальнасць аўтарскага вызначэння жанру, назваў частак твора, кампазіцыйнай пабудовы («Трыбунал», «Верачка», «Пагарэльцы», інш.). Агульначалавечая скіраванасць твораў. Моўна-вобразнае майстэрства драматурга. Спецыфіка сатыры А. Макаёнка – «смех праз слёзы». Сучаснае прачытанне п’ес «Трыбунал», «Зацюканы апостал».

## Тэма 2.12. Іван Мележ

Іван Мележ (1921–1976): біяграфічныя звесткі. «Першая кніга» І. Мележа. К. Чорны пра раннія апавяданні. Тэматыка, мастацкія асаблівасці твораў са зборнікаў «У завіруху», «Гарачы жнівень». Праца над «Мінскім напрамкам». Рэдакцыі твора. Раман І. Мележа ў кантэксце літаратуры свайго часу пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Вобраз маршала Чарняхоўскага. Выдаткі першага звароту пісьменніка да вялікай эпічнай формы. Праблематыка апавяданняў, аповесцей, п’ес 1950-х гадоў. Задума «Палескай хронікі» і яе рэалізацыя. Сімволіка назваў частак. Узмацненне трагедыйнага пафасу ў апошніх творах «Палескай хронікі». Сюжэтныя лініі Халімона Глушака, Васіля Дзятла ў накідах да няскончаных раманаў. Паказ трагедыі селяніна-гаспадара. Вобразы кіраўнікоў (Апейка, Башлыкоў, Міканор, Дубадзел). І. Мележ пра два тыпы калектывізацыі. Сучаснае прачытанне вобраза Апейкі. Шматгалоссе народнага жыцця ў раманах «Людзі на балоце», «Подых навальніцы». Адметнасць чалавечых характараў. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка. Асаблівасці стылю празаіка. Тэматычнае, праблемнае, жанравае наватарства раманаў. Месца твораў у літаратуры пра калектывізацыю. Кніга І. Мележа «Жыццёвыя клопаты».

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ»**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Ссамастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ** | **60** | **60** | **120** | | | |
| | **V семестр** | | | | | | |
| **1.** | **ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ 20–30-Х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ** | **24** | **24** | **60** | | | |
| **1.1.** | **Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў** | **2** | | **8** | | | |
| 1.1.1. | Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў<br>1. Актывізацыя культурна-грамадскага жыцця. Палітыка беларусізацыі, яе плённае ўздзеянне на агульны стан нацыянальнай культуры.<br>2. Стварэнне літаратурных арганізацый «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», інш. Ідэйна-эстэтычныя праграмы аб’яднанняў.<br>3. «Маладнякоўская» паэзія і проза.<br>4. Праблемна-тэматычная, жанрава-стылявая шматстайнасць твораў сяброў «Узвышша».<br>5. Пошукі і набыткі паэзіі, прозы, драматургіі. | 2 | | 8 | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [1]<br>[3]<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[9]<br>[12] | |
| **1.2.** | **Максім Гарэцкі** | **4** | **6** | **12** | | | |
| 1.2.1. | Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага<br>1. Біяграфічныя звесткі. Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве.<br>2. Праблемна-тэматычнае і жанрава-стылявое наватарства | 4 | | 12 | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [1]<br>[3]<br>[8] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | прозы М. Гарэцкага. Тэма інтэлігенцыі і народа.<br>3. Зборнік прозы «Рунь» у кантэксце нацыянальнага эпасу пачатку XX стагоддзя.<br>4. Вобраз інтэлігента-адраджэнца ў апавяданнях і аповесцях («У чым яго крыўда?», «Меланхолія», інш.).<br>5. Жыццё беларускай вёскі ў аповесці «Ціхая плынь». Тыповасць лёсу галоўнага героя. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў творы.<br>6. Раманы «Віленскія камунары», «Камароўская хроніка»: гісторыя напісання, праблематыка, жанравая адметнасць.<br>7. Цыкл «Сібірскія абразкі».<br>8. Апошнія творы пісьменніка («Скарбы жыцця», «Лявоніус Задумекус», «Кіпарысы»).<br>9. Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве.<br>10. М. Гарэцкі – крытык і літаратуразнаўца. «Гісторыя беларускае літаратуры». | | | | | | |
| 2.2. | Тэматычнае і жанрава-стылявое багацце прозы Максіма Гарэцкага<br>1. Жанравая і тэматычная разнастайнасць апавяданняў са зборніка «Рунь».<br>2. Філасофская праблематыка аповесцей «У чым яго крыўда?», «Меланхолія». Характар светаадчування, духоўныя пошукі Лявона Задумы. Асаблівасці кампазіцыі.<br>3. Жыццё беларускай вёскі ў аповесці «Ціхая плынь». Тыповасць лёсу галоўнага героя. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў творы.<br>4. Падзеі Першай сусветнай вайны ў асэнсаванні М. Гарэцкім (запіскі «На імперыялістычнай вайне», апавяданні «Літоўскі хутарок», «Рускі», «Генерал»). Гуманістычная пазіцыя аўтара.<br>5. Паслярэвалюцыйныя падзеі ў адлюстраванні М. Гарэцкім (аповесць «Дзве душы»). Інтэлігент Абдзіраловіч і яго пазіцыя.<br>6. Вобразы прадстаўнікоў розных грамадска-палітычных арыентацый. | | 6 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [1]<br>[3]<br>[8] | Апытванне, гутарка, напісанне эсэ. |
| **1.3.** | **Творчасць пісьменнікаў «Маладняка» і «Узвышша»** | **14** | **16** | **32** | | | |
| **1.3.1.** | **Андрэй Мрый** | **2** | **2** | **6** | | | |
| 1.3.1.1. | Жыццёвы і творчы шлях Андрэя Мрыя | 2 | | 6 | Гісторыя беларускай | [9] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. Адметнасць таленту.<br>3. Апавяданні «ўзвышанскага» перыяду. Нетрадыцыйнасць герояў, асаблівасці мовы твораў.<br>4. «Запіскі Самсона Самасуя». Гісторыя публікацыі, прачытанне рамана ў 1920-я гады і ў наш час; асаблівасці формы, сувязь твора з надзённай рэчаіснасцю («культурная» рэвалюцыя, барацьба з перажыткамі мінулага і г.д.). Сутнасць жыццёвай філасофіі героя. | | | | літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [12] | |
| 1.3.1.2. | Раман Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя»<br>1. «Запіскі Самсона Самасуя». Гісторыя публікацыі, прачытанне рамана ў 1920-я гады і ў наш час.<br>2. Самсон Самасуй – чалавек новай грамадскай фармацыі. Тыповасць, універсальнасць адкрытага А. Мрыем вобраза.<br>3. Грамадская атмасфера канца 1920-х у творы. Шапялёўка і яе ваколіцы – мадэль маладой савецкай дзяржавы.<br>4. Інтэлігенцыя Шапялёкі: характарыстыка вобразаў другога плана.<br>5. Жанравая адметнасць рамана, структура і кампазіцыя.<br>6. Раман А. Мрыя ў кантэксце сатырычнай прозы 1920–1930-х гадоў. | | 2 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [9]<br>[12] | Апытванне, гутарка. |
| **1.3.2.** | **Міхась Чарот** | **2** | **2** | **6** | | | |
| 1.3.2.1. | Жыццёвы і творчы шлях Міхася Чарота<br>1. Жыццёвы і творчы шлях.<br>2. Месца М. Чарота ў літаратурным працэсе 1920-х гадоў. Вызначальныя рысы паэзіі.<br>3. Вобраз рэвалюцыі ў зборніку «Завіруха».<br>4. Ліра-эпас пісьменніка. Паэма «Босыя на вогнішчы». Сімволіка вобразаў, розныя трактоўкі «босых».<br>5. Жанравая разнастайнасць прозы. Гуманістычны пафас твораў пра лёс прадстаўнікоў старога свету («Галя», «Талачка-шкрабалачка»).<br>6. П’есы для дзяцей. Драма «На Купалле».<br>7. Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча і Я. Купалы ў камедыі-вадэвілі «Мікітаў лапаць».<br>8. Апошні верш М. Чарота. | 2 | | 6 | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [9]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3.2.2. | Месца Міхася Чарота ў літаратурным працэсе 1920-х гадоў<br>1. Вызначальныя рысы паэзіі. Вобраз рэвалюцыі ў зборніку «Завіруха».<br>2. Паэма «Босыя на вогнішчы». Сімволіка вобразаў, розныя трактоўкі «босых».<br>3. Жанравая разнастайнасць прозы М. Чарота («Галя», «Талачка-шкрабалачка»).<br>4. Драматургічная спадчына пісьменніка. | | 2 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [9]<br>[12] | Апытванне, гутарка, аналіз верша. |
| **1.3.3.** | **Уладзімір Жылка** | **2** | **2** | **6** | | | |
| 1.3.3.1. | Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Жылкі<br>1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. «Віленскі» і «пражскі» перыяды творчасці.<br>3. Стасункі з «Маладняком» і «Узвышшам» .<br>4. Традыцыі М. Багдановіча ў творчасці У. Жылкі.<br>5. У. Жылка – крытык і перакладчык. | 2 | | 6 | 1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[12] | |
| 1.3.3.2. | Роля Уладзіміра Жылкі ў станаўленні мастацтва слова першай трэці ХХ стагоддзя<br>1. Гістарычны лёс радзімы, незалежніцкія і адраджэнскія матывы ў творах У. Жылкі («Хто мужны, хто смелы, хто дужы...», «Беларусь», інш.).<br>2. Танальнасць філасофскай лірыкі У. Жылкі («На ростані», «Бяспынна, глуха процьма часу...», «Усе мы страчаныя...» і інш.).<br>3. Міні-паэма «Тэстамент» – споведзь і запавет паэта наступным пакаленням. Вобраз аўтара ў творы. | | 2 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[12] | Апытванне, гутарка, аналіз верша. Рэйтынгавая кантрольная работа № 1. |
| **1.3.4.** | **Уладзімір Дубоўка** | **2** | **2** | **6** | | | |
| 1.3.4.1. | Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Дубоўкі<br>1. Жыццяпіс.<br>2. Раннія зборнікі «Строма», «Трысцё», «Credo», іх мастацка-вобразная адметнасць.<br>3. Выявы «маладнякоўскай бурапеннасці». Стаўленне Дубоўкі-маладнякоўца да класічнай спадчыны.<br>4. Зварот да ліра-эпасу («Там, дзе кіпарысы», «Плач буры», інш.).<br>5. У. Дубоўка і М. Багдановіч.<br>6. Уклад У. Дубоўкі ў развіццё паэмнага жанру («Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!»). | 2 | | 6 | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Шырокае выкарыстанне фальклору ў творах «узвышанскага» перыяду, пошук паэтычных форм.<br>8. Творчасць 1950–1970-х гадоў.<br>9. Гісторыя напісання зборніка «Палеская рапсодыя». | | | | | | |
| 1.3.4.2. | Паэтычны эпас Уладзіміра Дубоўкі<br>1. Паэмны трыпціх «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!». Сюжэтнае і кампазіцыйнае наватарства паэм.<br>2. Тэма мастака і мастацтва ў паэтычнай трылогіі «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!».<br>3. Творы ва ўспрыманні крытыкі 1920-х гадоў і іх сучаснае прачытанне (М. Арочка, В. Максімовіч). | | 2 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[12] | Апытванне, гутарка, аналіз паэмы. |
| **1.3.5.** | **Міхась Зарэцкі** | **4** | **6** | **4** | | | |
| 1.3.5.1. | Жыцёвы і творчы шлях Міхася Зарэцкага<br>1. Жыццёвы і творчы шлях.<br>2. Рысы «маладнякоўскай» прозы ў ранніх апавяданнях (зборнікі «У віры жыцця», «Пела вясна»).<br>3. Абарона агульначалавечых каштоўнасцей («Адна партыя ў шашкі», «Ворагі», «Кветка пажоўклая», «Бель», «Дзіўная»).<br>4. Навізна праблематыкі першых вялікіх эпічных твораў («Голы звер», «Сцежкі-дарожкі»), сюжэтна-кампазіцыйнае майстэрства празаіка.<br>5. Нарыс «Падарожжа на Новую зямлю», няскончаны раман «Крывічы» ў творчым і чалавечым лёсе аўтара.<br>6. Раман «Вязьмо».<br>7. Тэматыка і праблематыка п’ес «Віхор на балоце», «Белыя ружы».<br>8. Пытанне пра творчы метад пісьменніка. | 4 | | 4 | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3.5.2. | Проза Міхася Зарэцкага: гуманістычны пафас, навізна праблематыкі, мастацкія асаблівасці твораў<br>1. Шырокі жанравы і тэматычны дыяпазон творчасці М. Зарэцкага («Бель», «Дзіўная», «Адна партыя ў шашкі», «Ворагі», «Кветка пажоўклая», «Двое Жвіроўскіх», «Паэма пра чорныя вочы», «Ой, ляцелі гусі...»).<br>2. Навізна праблематыкі першых вялікіх эпічных твораў («Голы звер», «Сцежкі-дарожкі»).<br>3. Раман «Вязьмо». Віна і бяда Сымона Карызны.<br>4. Багацце і разнастайнасць чалавечых характараў у рамане. Вобраз Галілея і яго функцыянальная роля ў ідэйным змесце твора. Вобразы жанчын «новага часу».<br>5. Раман М. Зарэцкага ў кантэксце літаратуры свайго часу пра «вялікі пералом». | | 6 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[12] | Апытванне, гутарка, аналіз апавядання. |
| **1.3.6.** | **Язэп Пушча** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 1.3.6.1. | Жыцёвы і творчы шлях Язэпа Пушчы<br>1. Факты біяграфіі.<br>2. Пафас «маладнякоўскіх» зборнікаў «Раніца рыкае», «Vita».<br>3. Змена танальнасці ў кнігах «Дні вясны» і «Песні на руінах». Матывы і вобразы цыклаў «Асеннія песні», «Лісты да сабакі».<br>4. Задума стварэння паэмнай трылогіі і яе мастацкае ўвасабленне. Рэалістычны і сімвалічны планы прачытання паэм «Песня вайны», «Цень Консула». Архітэктоніка твораў.<br>5. Паэма «Сады вятроў». Тэма мастак і народ у ліра-эпасе Я. Пушчы.<br>6. Пушча-крытык пра ролю творцы і літаратуры ў грамадскім жыцці (артыкулы «У абарону маладой паэзіі», «Максім Лужанін. Крокі» і інш.).<br>7. Зборнікі Я. Пушчы 1960-х гадоў «Вершы і паэмы», «Пачатак легенды». Змест ненадрукаваных пры жыцці аўтара вершаў. | 2 | | 4 | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [9]<br>[12] | |
| 1.3.6.2. | Маладнякоўскі» і «ўзвышанскі» перыяды ў творчасці Язэпа Пушчы<br>1. Адметнасць «маладнякоўскіх» зборнікаў паэта: пафаснасць, каларытнасць вобразаў (зб. «Раніца рыкае», «Vita»).<br>2. Ускладненне вобразнай сістэмы «ўзвышанскага» перыяду: падтэкст, умоўнасць, сімволіка (цыклы «Асеннія песні», «Лісты да сабакі»).<br>3. Роздум пісьменніка над нядаўнім мінулым і сучаснасцю ў | | 2 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [9]<br>[12] | Апытванне, гутарка, аналіз верша. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | паэмах «Песня вайны», «Цень Консула», «Сады вятроў», тэма мастака і мастацтва ў творах.<br>4. Рэалістычны і сімвалічны планы прачытання паэм «Песня вайны», «Цень Консула». Архітэктоніка твораў. | | | | | | |
| **1.4.** | **Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гадоў. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі** | **2** | | **4** | | | |
| 1.4.1. | Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гадоў. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі<br>1. Маласпрыяльныя ўмовы для творчасці.<br>2. Адыход ад рэалістычных традыцый узнаўлення падзей, ідэалізацыя і прыхарошванне як норма ў творчасці.<br>3. Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Стварэнне Саюза пісьменнікаў СССР.<br>4. З'яўленне тэрміна сацыялістычны рэалізм, яго сутнасць.<br>5. Адкрытае і прыхаванае непрыманне пісьменнікамі таталітарнай улады.<br>6. Асуджэнне прымусовай калектывізацыі, паспешлівасці ў яе правядзенні (аповесці і раманы Я. Коласа «Адшчапенец», Б. Мікуліча «Чорная Вірня», М. Зарэцкага «Вязьмо», п'есы К. Чорнага «Лета», В. Шашалевіча «Рой»).<br>7. Адстойванне ідэі даверу да чалавека (камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»).<br>8. Матывы расчараванасці і смутку ў паэзіі У. Хадыкі, З. Астапенкі, С. Астрэйкі. | 2 | | 4 | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [3]<br>[9]<br>[12] | |
| **1.5.** | **Літаратура Заходняй Беларусі** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 1.5.1. | Літаратура Заходняй Беларусі<br>1. Мінск і Вільня як два культурныя цэнтры Беларусі. Перадумовы і прычыны гэтага. Папулярнасць ідэі аб'яднання ў абедзвюх частках краіны.<br>2. Грамадска-палітычнае жыццё на «крэсах усходніх». Этапы нацыянальна-вызваленчага руху.<br>3. Перыядычныя выданні на беларускай мове.<br>4. «Віленскі» перыяд у творчасці М. Гарэцкага, У. Жылкі.<br>5. Асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны, дзяржаўнасці народа публіцыстыкай.<br>6. Літаратурна-філасофскія эсэ І. Канчэўскага, У. Самойлы.<br>7. Неаднароднасць літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі. Пашырэнне масавай паэзіі, літаратуры факта. | 2 | | 4 | Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. | [3]<br>[9]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 8. Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў паэзіі 1930-х гадоў (творчасць М. Танка, М. Машары, М. Засіма, В. Таўлая). | | | | | | |
| 1.5.2. | Асаблівасці літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі<br>1. «Віленскі» перыяд у творчасці М. Гарэцкага, У. Жылкі.<br>2. Рэлігійная паэзія Заходняй Беларусі.<br>3. Неаднароднасць літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі. Пашырэнне масавай паэзіі, літаратуры факта.<br>4. Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў паэзіі 1930-х гадоў (творчасць М. Танка, М. Машары, М. Засіма, В. Таўлая). | | 2 | | 1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015.<br>2. Тэксты твораў пісьменнікаў. | [3]<br>[9]<br>[12] | Апытванне, гутарка, падрыхтоўка прэзентацый. Рэйтынгавая кантрольная работа № 2. |
| | **Усяго ў V семестры** | **24** | **24** | **60** | | | **Экзамен** |
| **2.** | **ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ПАСЛЯВАЕННАГА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ** | **36** | **36** | **48** | | | |
| **2.1.** | **Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны** | **2** | | **4** | | | |
| | Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны<br>1. Тэма будучай вайны ў літаратуры і мастацтве (песні, кнігі, кінафільмы).<br>2. Асаблівасці раскрыцця тэмы беларускімі аўтарамі (вершы і паэмы П. Панчанкі, А. Куляшова, інш.).<br>3. Ваенныя дарогі беларускіх пісьменнікаў.<br>4. Паэтычны зварот Я. Купалы да свайго народа («Беларускім партызанам»).<br>5. Перавага лірыкі над іншымі родамі літаратуры.<br>6. Шырокае бытаванне балады і вершаў баладнага тыпу. Вобраз Беларусі-змагаркі і Беларусі-паланянкі.<br>7. Ліра-эпас ваенных гадоў. Абумоўленасць тэматыкі, ідэйнага зместу твораў суровым подыхам часу.<br>8. Сацыяльна-філасофскія раманы К. Чорнага («Млечны шлях», «Пошукі будучыні», «Вялікі дзень»), іх выключанасць з літаратурнага працэсу 1940-х гадоў. | 2 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [1]<br>[2]<br>[7]<br>[9]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |
| **2.2.** | **Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1946–1956)** | **2** | | **4** | | | |
| | Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя<br>1. Пастановы ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабоце Саюза пісьменнікаў, літаратурна-мастацкіх часопісаў і газет. Сутнасць тэорыі бесканфліктнасці, яе выявы ў драматургіі, прозе, паэзіі.<br>2. Паслабленне сувязей паэзіі з жыццём. Ідэалізацыя | 2 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [1]<br>[2]<br>[7]<br>[10]<br>[11] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | рэчаіснасці, ілюстрацыйнасць, адрыў лірычнага «я» ад асобы аўтара. Эпізацыя лірыкі.<br>3. Праблемы мінулай вайны і адбудовы мірнага жыцця ў ліра-эпасе (паэмы П. Броўкі «Хлеб», А. Куляшова «Новае рэчышча», «Толькі ўперад», «Грозная пушча» і інш.).<br>4. Праца ў літаратуры пісьменнікаў старэйшага пакалення (Я. Коласа, М. Лынькова).<br>5. Адлюстраванне гераічнага змагання беларускага народа ў гады вайны ў аповесцях і раманах І. Шамякіна («Глыбокая плынь»), А. Кулакоўскага («Расстаёмся ненадоўга»), І. Мележа («Мінскі напрамак») і інш..<br>6. Тэма стваральнай працы ў прозе А. Стаховіча, У. Краўчанкі, М. Паслядовіча, Т. Хадкевіча, А. Кулакоўскага («Пад мірным небам», «Станаўленне», «Цёплае дыханне», «Вяснянка», «Гартаванне» і інш.). Выдаткі твораў.<br>7. Аповесці і раманы пра мірнае жыццё І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля.<br>8 Набыткі і страты пасляваеннай драматургіі (п'есы К. Крапівы «З народам», «Пяюць жаваранкі», «Людзі і д'яблы», «Зацікаўленая асоба», А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў», К. Губарэвіча «Брэсцкая крэпасць» і інш.). | | | | | [12] | |
| **2.3.** | **Кандрат Крапіва** | **4** | **4** | **4** | | | |
| 2.3.1. | Жыццёвы і творчы шлях Кандрата Крапівы<br>1. Жыццёвы і творчы шлях.<br>2. Аб'екты аўтарскага смеху ў ранніх паэтычных і празаічных зборніках.<br>3. Праблематыка, героі баек, традыцыі народнай смехавой культуры ў творах.<br>4. Зварот да парадыйнай і сатырычнай паэмы («Біблія», «Шкірута», «Хвядос – Чырвоны нос»).<br>5. К. Крапіва пра месца сатыры ў жыцці і літаратуры.<br>6. Спроба стварэння рамана «Мядзведзічы».<br>7. Першыя п'есы пісьменніка («Канец дружбы», «Партызаны»).<br>8. Месца сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім» у творчай спадчыне К. Крапівы.<br>9. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе мастацкае вырашэнне ў драме «Проба агнём».<br>10. Нетрадыцыйны паказ ваеннай рэчаіснасці ў сатырычнай | 4 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | камедыі «Мілы чалавек».<br>11. Уплыў тэорыі бесканфліктнасці на лірычную камедыю «Пяюць жаваранкі».<br>12. «Брама неўміручасці» як філасофскі роздум драматурга над сутнасцю чалавечага існавання. | | | | | | |
| 2.3.2. | Сатырычнае майстэрства Кандрата Крапівы<br>1. Сатыра ў творчасці Крапівы 1920-х гг. (вершы, фельетоны, апавяданні, паэмы).<br>2. Крапіва-байкапісец: аб’екты сатырычнага высмейвання, алегарычныя вобразы-тыпы ў творах.<br>3. Праблематыка, героі баек, традыцыі народнай смехавой культуры ў творах. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў Кандрата Крапівы. | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Апытванне, гутарка, тэсціраванне ў СДН Moodle: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2431 |
| 2.3.3. | Кандрат Крапіва-драматург<br>1. Месца сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім» у творчай спадчыне К. Крапівы. Гуманістычная ідэя твора, сутнасць канфлікту, вобразы персанажаў. Майстэрства драматурга.<br>2. Нетрадыцыйны паказ ваеннай рэчаіснасці ў сатырычнай камедыі «Мілы чалавек». Зварот пісьменніка да сродкаў тэатральнай умоўнасці, сцэнічны лёс камедыі. Адрознасць характараў Жлукты і Гарлахвацкага.<br>3. «Брама неўміручасці» як філасофскі роздум драматурга над сутнасцю чалавечага існавання. Галерэя сатырычных тыпаў і вобразаў. Фантастычныя элементы ў сюжэце, тыповасць узноўленых калізій і характараў. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў Кандрата Крапівы. | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Франтальнае апытванне, гутарка, тэсціраванне ў СДН Moodle |
| **2.4.** | **Міхась Лынькоў** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 2.4.1. | Жыццёвы і творчы шлях Міхася Лынькова<br>1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. Паказ у ранніх творах (апавяданні «Над Бугам», «Маньчжур» і інш.) нараджэння новага чалавека.<br>3. Тэма Заходняй Беларусі ў творчасці.<br>4. Адметнасць стылявой манеры М. Лынькова.<br>5. Праца над раманам «На чырвоных лядах».<br>6. «Малая» проза ваеннага часу (зборнік «Астап»). Вобразы дзяцей у творах («Васількі», «Дзіцячы башмачок» і інш.). | 2 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Спроба шырокага эпічнага асэнсавання подзвігу народа ў рамане «Векапомныя дні». Багатая падзейная аснова твора, рэальныя прататыпы герояў. Месца рамана ў беларускай ваеннай прозе. | | | | | | |
| 2.4.2. | Міхась Лынькоў-апавядальнік<br>1. «Малая» проза ваеннага часу (зборнік «Астап»). Вобразы дзяцей у творах («Васількі», «Дзіцячы башмачок» і інш.).<br>2. Спроба шырокага эпічнага асэнсавання подзвігу народа ў рамане «Векапомныя дні». Багатая падзейная аснова твора, рэальныя прататыпы герояў.<br>3. Месца рамана ў беларускай ваеннай прозе. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Аналітычная гутарка, тэсціраванне ў СДН Moodle |
| **2.5.** | **Кузьма Чорны** | **4** | **6** | **4** | | | |
| 2.5.1. | Жыццёвы і творчы шлях Кузьмы Чорнага<br>1. Жыццёвы і творчы шлях.<br>2. Старонкі «Дзённіка» К. Чорнага пра жыццё ў Маскве і на радзіме.<br>3. Вобраз пісьменніка ў мастацкай літаратуры. Уплыў Чорнага на творчасць беларускіх празаікаў.<br>4. Першыя публікацыі. Асаблівасці апавяданняў «маладнякоўскага» і «ўзвышанскага» перыядаў.<br>5. Творчае крэда пісьменніка – «Чалавек – гэта цэлы свет».<br>6. Блізкасць першых раманаў «Сястра», «Зямля» да апавяданняў.<br>7. Задума стварэння цыкла эпічных твораў пра гістарычны шлях народа. Арыгінальнасць мастацкай ідэі.<br>8. Цікавасць празаіка да філасофскіх праблем. Здзейсненае і нявдзейсненае К. Чорным.<br>9. Тэматыка, праблематыка, мастацкія асаблівасці, цэнтральныя вобразы раманаў «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне», аповесцей «Лявон Бушмар», «Люба Лук'янская». Сучаснае прачытанне «Трэцяга пакалення».<br>10. Змены ў светапоглядзе пісьменніка ў 1930-я гады.<br>11. Вяртанне К. Чорнага ў час Вялікай Айчыннай вайны да ідэі складанасці чалавечага свету. Вяршынныя творы пісьменніка – раманы «Млечны шлях», «Пошукі будучыні», «Вялікі дзень».<br>12. Асаблівасці стылю К. Чорнага. | 4 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.5.2. | Станаўленне творчай індывідуальнасці Кузьмы Чорнага<br>1. Рысы «маладнякоўскай» прозы ў ранніх творах: эмацыянальнасць, матыў радасці жыцця, малападзейнасць, фрагментарнасць.<br>2. Вера пісьменніка ў гуманізм новых людзей і новага часу (апавяданні «Ноч пры дарозе», «Новыя людзі», «Вечар» і інш.), захапленне складанасцю чалавечага свету.<br>3. Паглыбленне псіхалагізму, зварот да філасофскай праблематыкі, сцвярджэнне значнасці і змястоўнасці ўнутранага свету чалавека працы ў апавяданнях «узвышанскага» перыяду («Буланы», «Хвоі гавораць», «Вераснёвыя ночы»). | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Напісанне эсэ, тэсціраванне ў СДН Moodle |
| 2.5.3. | Кузьма Чорны – раманіст<br>1. Нараджэнне задумы раманнага цыклу.<br>2. Раман «Трэцяе пакаленне».<br>3. Раманы ваеннага часу («Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень»).<br>4. Паказ у раманах трагічных калізій гістарычнага лёсу народа, вызначальных рыс характару беларуса: любоў да роднай зямлі, сумленнасць, спагадлівасць, вольналюбства, і інш. (вобразы Нявады, Кастуся Лукашэвіча, Сымона Ракуцькі, Мікалая Сямагі, Уладзіміра Ярмаліцкага, Максіма Астаповіча).<br>5. Выяўленне сутнасці ідэалогіі фашызму (вобразы малодшага Шрэдэра, Адама Блецькі, Тоўхарта).<br>6. Філасофскі і сімвалічны змест вобразаў Вялікага скрыжавання, Млечнага шляху, Вялікага Злодзея, украдзенага маленства, золата.<br>7. А.Адамовіч пра месца раманаў Чорнага ў нацыянальнай «ваеннай» прозе.<br>8. Незавершаныя творы пісьменніка. | | 4 | | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Франтальнае апытванне, тэсціраванне ў СДН Moodle. Рэйтынгавая кантрольная работа № 1. |
| **2.6.** | **Пятрусь Броўка** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 2.6.1. | Жыццёвы і творчы шлях Петруся Броўкі<br>1. Скіраванасць паэта на абстрактна-рытарычную паэзію ў ранніх зборніках. Наследаванне У. Маякоўскаму.<br>2. Творчая пераарыентацыя пісьменніка (зборнік «Прыход героя»). Адарванасць ад рэалій жыцця многіх твораў 1930-х гадоў (паэма «Кацярына», вершы «Плыві, наша песня, далёка...», «З новым годам» і інш.). | 2 | | 4 | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [1]<br>[2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Тэндэнцыя да актыўнага самавыяўлення ў творах перыяду Вялікай Айчыннай вайны (вершы «Маці», «Роднае», «Надзя-Надзейка», «Спатканне» і інш., паэма-маналог «Беларусь»).<br>4. Балада ў творчасці П. Броўкі.<br>5. Прыглушанасць лірычнага пачуцця ў творах першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (зборнікі «Сонечнымі днямі», «Цвёрдымі крокамі», інш.).<br>6. Спроба напісання рамана «Калі зліваюцца рэкі».<br>7. Прарывы да асэнсавання агульначалавечых каштоўнасцей (паэма «Голас сэрца», вершы «Александрына», «Пахне чабор», «Калі надыдзе час спачыну…», інш.) і паэтычны гладкапіс у творчасці 1960–1970-х гадоў.<br>8. Пераацэнка творчай спадчыны П. Броўкі. Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя прычыны нерэалізаваных магчымасцей мастака. | | | | | | |
| 2.6.2. | Адметнасць паэтычнага голасу Петруся Броўкі<br>1. Ранні этап творчасці П. Броўкі.<br>2. Змены ў паэзіі другой паловы 1930-х гг. Пошукі свайго шляху. Адмаўленне ад лірызму, штучнасць вобразаў, скіраванасць на літаратуру факта.<br>3. Балады і паэмы перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Сыноўні боль за лёс Радзімы у творах ваеннага часу. Зварот да фальклорных сродкаў.<br>4. Творчасць першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Набыткі і страты пісьменніка ў 1950-70-я гады. Асаблівасці таленту.<br>5. Лірыка апошніх дзесяцігоддзяў.<br>6. Паэма-рэквіем «Голас сэрца». | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Зборнікі паэзіі Петруся Броўкі. | [1]<br>[2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Аналітычная гутарка, пісьмовы аналіз верша на выбар |
| **2.7.** | **Максім Танк** | **4** | **4** | **4** | | | |
| 2.7.1. | Жыццёвы і творчы шлях Максіма Танка<br>1. Жыццяпіс.<br>2. Давераснёўскі перыяд творчасці.<br>3. Месца М. Танка ў літаратурным працэсе 1930-х гадоў. Лёс зборніка «На этапах». Спробы маладога аўтара выйсці за межы традыцыйнай паэзіі.<br>4. Жанравая адметнасць ліра-эпасу, вобразы абаронцаў народа.<br>5. М. Танк пра ўз’яднанне Беларусі ў «Лістках календара» і «Дзённіках».<br>6. Паэзія ваеннага перыяду. Пашырэнне тэматычнага дыяпазону ў зборніках «Каб ведалі», «На камні, жалезе і | 4 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | золаце», «У дарозе». Паэма «Люцыян Таполя» як пратэст супраць несвабоды мастака.<br>7. Выявы тэорыі бесканфліктнасці ў лірыцы пасляваеннага дзесяцігоддзя.<br>8. Паглыбленне філасофскага пачатку, ускладненне мастацка-вобразнай сістэмы твораў у зборніках «След бліскавіцы», «Мой хлеб надзённы», «Глыток вады», «Дарога, закалыханая жытам» і інш.<br>9. Тэматыка, праблематыка лірыкі 1980–1990-х гадоў. Сімволіка назваў кніг «Збор калосся», «Мой каўчэг», «Errata».<br>10. Вызначальныя рысы паэзіі М. Танка.<br>11. М. Танк – майстар верлібра. | | | | | | |
| 2.7.1. | Вершы Максіма Танка 1930–1950-х гадоў<br>1. Давераснёўскі перыяд творчасці Максіма Танка. Зборнік «На этапах».<br>2. Жанравая адметнасць ліра-эпасу («Нарач», «Журавінавы цвет», «Сказ пра Вяля», «Янук Сяліба»). Вобразы змагароў за народнае шчасце ў творах.<br>3. Паэзія М. Танка ваеннага перыяду.<br>4. Выявы тэорыі бесканфліктнасці ў лірыцы 1950-х гадоў.<br>5. Тэма мастака і мастацтва ў паэме «Люцыян Таполя». Вобразы Люцыяна Таполі і біскупа Сямашкі. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Зборнікі паэзіі Максіма Танка. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Напісанне эсэ. |
| 2.7.2. | Аналіз кніг Максіма Танка «Збор калосся», «Мой каўчэг», «Errata»<br>1. Сімволіка назваў апошніх кніг «Збор калосся», «Мой каўчэг», «Errata». Вызначальныя рысы паэзіі М. Танка.<br>2. Светаадчуванне паэта ў апошнія гады жыцця. Танальнасць кніг. Роздум пісьменніка над часам, чалавечымі дзеямі, уласным лёсам.<br>3. Лірыка М. Танка ў сацыякультурным кантэксце 1980–1990-х гадоў.<br>4. Прыёмы і сродкі лірычнага самавыяўлення паэта. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Зборнікі паэзіі Максіма Танка. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Стварэнне верлібраў, цэнтонаў. Рэйтынгавая кантрольная работа № 2. |
| **2.8.** | **Аркадзь Куляшоў** | **4** | **4** | **4** | | | |
| 2.8.1. | Жыццёвы і творчы шлях Аркадзя Куляшова<br>1. Факты жыцця і творчасці.<br>2. Даніна «маладнякізму» і рытарычнасці ў зборніках «Росквіт зямлі», «Па песню, па сонца!..», «Медзі дождж».<br>3. Праблематыка нізак вершаў «Маім аднагодкам», «Сонечнае | 4 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | заўтра», «Юнацкі свет».<br>4. Пошукі новай паэмнай формы ў творах «Крыўда», «Аманал», «Гарбун».<br>5. Паэма-прадбачанне «Хлопцы апошняй вайны».<br>6. Гісторыя напісання твораў «Сцяг брыгады», «Балада аб чатырох заложніках», «Ліст з палону». Сучаснае прачытанне паэмы «Сцяг брыгады», вершаў «Камуністы», «Інтэрнацыянал».<br>7. «Новая кніга» як адмаўленне ад ілюстрацыйнасці паэзіі 1950-х гадоў. Паварот да філасофскага асэнсавання жыцця. «Касмічная» нізка вершаў.<br>8. Асэнсаванне катэгорый Часу, Вечнасці, Жыцця, Смерці ў вершах 1960–1970-х гадоў. Тэма паэта і паэзіі, шматаспектнасць яе вырашэння ў вершах і паэмах.<br>9. Шматстайнасць жанравых форм ліра-эпасу («Маналог», «Цунамі», «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях», «Хамуціус»).<br>10. А. Куляшоў – перакладчык. | | | | дзесяцігоддзя». | | |
| 2.8.2. | Лірыка Аркадзя Куляшова<br>1. Асаблівасці лірыкі Аркадзя Куляшова.<br>2. Даніна «маладнякізму» і рытарычнасці ў зборніках «Росквіт зямлі», «Па песню, па сонца!..», «Медзі дождж».<br>3. «Новая кніга» як адмаўленне ад ілюстрацыйнасці паэзіі 1950-х гадоў. Паварот да філасофскага асэнсавання жыцця.<br>4. Асэнсаванне катэгорый Часу, Вечнасці, Жыцця, Смерці ў вершах 1960–1970-х гадоў. Тэма паэта і паэзіі, шматаспектнасць яе вырашэння ў вершах. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Зборнікі паэзіі Аркадзя Куляшова. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Праблемны аналіз вершаў. |
| 2.8.3. | Ліра-эпас Аркадзя Куляшова<br>1. Лёс чалавечай цывілізацыі ў паэме «Цунамі». Умоўнасць сітуацыі і герояў.<br>2. Паэма «Далёка да акіяна» як аповед пра лёс пакалення. Маштабнасць падзей у творы.<br>3. Тэма паэта і паэзіі ў «Варшаўскім шляху». Вобраз А. Твардоўскага.<br>4. Сацыяльныя і філасофскія матывы ў паэме «Хамуціус».<br>5. Жанравая спецыфіка твораў, сімволіка вобразаў. | | 2 | | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Зборнікі паэзіі Аркадзя Куляшова. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Апытванне, гутарка, тэсціраванне ў СДН Moodle |
| **2.9.** | **Пімен Панчанка** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 2.9.1. | Жыццёвы і творчы шлях Пімена Панчанкі<br>1. Жыццёвы і творчы шлях. | 2 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры | [2]<br>[7] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Адметныя рысы творчасці 1930-х гадоў («Падсочка», «Выязджалі лесарубы», «Адкопаныя зарніцы», інш.). Уплыў М. Лермантава.<br>3. Творчасць гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Цыкл «Іранскі дзённік». Паэма «Маладосць у паходзе».<br>4. Імкненне паэта ўзняцца над беспраблемнасцю літаратуры першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.<br>5. Рэаліі замежнага жыцця ў зборніках 1950–1960-х гадоў. Шырокі тэматычны дыяпазон лірыкі. Зварот да сатыры.<br>6. Пераасэнсаванне падзей савецкай гісторыі, асабістага лёсу і лёсу народа ў кнігах 1980 – 90-х гг.<br>7. Узмацненне сатырычнага пачатку на апошнім этапе творчасці. Верш-некралог Р. Барадуліна «Пімену Панчанку». | | | | перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [10]<br>[11]<br>[12] | |
| 2.9.2. | Паэзія Пімена Панчанкі<br>1. Адметныя рысы творчасці 1930-х гадоў («Падсочка», «Выязджалі лесарубы», «Адкопаныя зарніцы», інш.).<br>2. Творчасць гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Цыкл «Іранскі дзённік».<br>3. Імкненне паэта ўзняцца над беспраблемнасцю, гладкапісам літаратуры першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.<br>4. Рэаліі замежнага жыцця ў зборніках 1950–1960-х гадоў. Шырокі тэматычны дыяпазон лірыкі. Зварот да сатыры («Прыстасаванцы», «Трэснула, грукнула...», «Бацька», «Здарэнне ў гасцях», інш.).<br>5. Роздум пісьменніка над лёсам народа, роднай зямлі, мовы, над наступствамі Чарнобыля, бездухоўнасцю ў творах 1970–1990-х гадоў.<br>6. Матывы расчаравання і пакаяння ў зборніках «І вера, і вернасць, і вечнасць», «Горкі жолуд», «Высокі бераг», «Зямля ў мяне адна».<br>7. Тэматычная і жанравая разнастайнасць лірыкі, пафасны паліфанізм, напоўненасць сродкамі мастацкай выразнасці. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Зборнікі паэзіі Пімена Панчанкі. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Франтальнае апытванне, пісьмовы. аналіз верша на выбар. |
| **2.10.** | **Янка Брыль** | **4** | **4** | **4** | | | |
| 2.10.1. | Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля<br>1. Факты жыцця і творчасці.<br>2. Апавяданні 1950-х гадоў («Маці», «Memento mori», «Галя», «Надпіс на зрубе»).<br>3. Лірычная проза пісьменніка. | 4 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Замалёўкі, абразкі, мініяцюры Я. Брыля. Асоба аўтара ў творах.<br>5. Вялікія жанравыя формы ў творчасці Я. Брыля. Праца над раманам «Граніца».<br>6. Тэматыка і праблематыка аповесцей «У Забалоцці днее», «На Быстранцы», «Ніжнія Байдуны».<br>7. Творчая гісторыя рамана «Птушкі і гнёзды».<br>8. «Сямейная сага» – аповесць «Муштук і папка».<br>9. Тэма дзяцінства ў творах Я. Брыля («Золак, убачаны здалёк», «Гуртавое», «Птушкі і гнёзды», інш.). | | | | дзесяцігоддзя». | | |
| 2.10.2. | Янка Брыль-апавядальнік<br>1. Эпічная і лірычная плыні ў ранніх творах пісьменніка.<br>2. Класічныя апавяданні 1950-х гадоў («Маці», «Memento mori», «Галя», «Надпіс на зрубе»).<br>3. Адметныя рысы Брыля-апавядальніка. Лірычная проза пісьменніка (апавяданні «Як маленькі», «Тройчы пра адзіноту», «Яшчэ раз першы снег», інш.).<br>4. Зварот да малых жанравых форм апавядання – замалёўкі, абразка, мініяцюры (кнігі «Жменя сонечных промняў», «Ты жывеш», «Сёння і памяць», «Вячэрняе», інш.). | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў пісьменніка. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Выкананне творчых заданняў. |
| 2.10.3. | Раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды»<br>1. Сэнс назвы рамана і яго частак.<br>2. Жанрава-стылявыя асаблівасці, аўтабіяграфізм твора.<br>3. Духоўнае сталенне Алеся Руневіча.<br>4. Паказ трагедыі нямецкага народа.<br>5. Тыпы беларусаў у рамане.<br>6. Роздум аўтара над лёсам свайго народа. | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў. | [2]<br>[7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Апытванне, гутарка, тэсціраванне ў СДН Moodle |
| **2.11.** | **Андрэй Макаёнак** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 2.11.1. | Жыццёвы і творчы шлях Андрэя Макаёнка<br>1. Біяграфія.<br>2. Жыццё калгаснай вёскі ў п’есах «Каб людзі не журыліся», «Лявоніха на арбіце», «Таблетку пад язык». Змена танальнасці ў творах. Тэматычнае і жанравае наватарства п’ес.<br>3. Зварот драматурга да трагікамедыі. Выкарыстанне сродкаў тэатральнай умоўнасці, элементаў фантастыкі, падтэксту («Зацюканы апостал», «Кашмар», «Дыхайце эканомна!..»).<br>4. Арыгінальнасць аўтарскага вызначэння жанру, назваў частак твора, кампазіцыйнай пабудовы («Трыбунал», «Верачка», | 2 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | «Пагарэльцы», інш.).<br>5. Моўна-вобразнае майстэрства драматурга. Спецыфіка сатыры А. Макаёнка – «смех праз слёзы». | | | | | | |
| 2.11.2. | Наватарства п’ес Андрэя Макаёнка<br>1. Шматстайнасць вобразаў-тыпаў у творах пісьменніка (Калібераў, Моцкін, Гарошка, Самасееў, Лявон Чмых, Ухватаў і інш.). Тэматычная, праблемная і жанравая навізна п’ес А.Макаёнка.<br>2. Камедыя «Выбачайце, калі ласка!». Востры жыццёвы канфлікт. Каліberaўшчына як сацыяльная з’ява.<br>3. «Трыбунал» як народны трагіфарс. Псіхалагічнае майстэрства А. Макаёнка ў стварэнні вобраза Калабка.<br>4. Мастацкая ўмоўнасць і абагульненасць вобразаў у трагікамедыі «Зацюканы апостал».<br>5. Сучаснае прачытанне п’ес «Трыбунал», «Зацюканы апостал». | | 2 | | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [2]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Апытванне, праблемная гутарка, тэсціраванне ў СДН Moodle |
| **2.12.** | **Іван Мележ** | **4** | **6** | **4** | | | |
| 2.12.1. | Жыццёвы і творчы шлях Івана Мележа<br>1. Біяграфічныя звесткі.<br>2. «Першая кніга» І. Мележа.<br>3. Праца над «Мінскім напрамкам». Рэдакцыі твора. Раман І. Мележа ў кантэксце літаратуры свайго часу пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны.<br>4. Праблематыка апавяданняў, аповесцей, п’ес 1950-х гадоў.<br>5. Задума «Палескай хронікі» і яе рэалізацыя. Сімволіка назваў частак. Узмацненне трагедыйнага пафасу ў апошніх творах «Хронікі». Сюжэтныя лініі Халімона Глушака, Васіля Дзятла ў накідах да нясконачаных раманаў.<br>6. Шматгалоссе народнага жыцця ў раманах «Людзі на балоце», «Подых навальніцы». Адметнасць характараў.<br>7. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка. Асаблівасці стылю празаіка.<br>8. Тэматычнае, праблемнае, жанравае наватарства раманаў. Месца твораў у літаратуры пра калектывізацыю.<br>9. Кніга І. Мележа «Жыццёвыя клопаты». | 4 | | 4 | ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя». | [7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | |
| 2.12.2. | Ранняя творчасць Івана Мележа<br>1. Тэматыка, мастацкія асаблівасці твораў са зборнікаў «У завіруху», «Гарачы жнівень». | | 2 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай | [7]<br>[10]<br>[11] | Праблемная гутарка. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Характары і абставіны ў апавяданнях ваеннага часу («Сустрэча», «Апошняя аперацыя», «У завіруху»).<br>3. «Першая кніга» Івана Мележа: гісторыя напісання і публікацыі. Асоба аўтара ў творы. Трагічныя калізіі вайны ва ўзнаўленні пісьменніка.<br>4. Рэаліі мірнага жыцця ў аповесці «Гарачы жнівень». Твор у ацэнцы крытыкі свайго часу. | | | | Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>2. Тэксты твораў І. Мележа. | [12] | |
| 2.12.3. | «Палеская хроніка» Івана Мележа<br>1. Задума «Палескай хронікі» і яе ўвасабленне.<br>2. Паказ трагедыі селяніна-гаспадара.<br>3. Вобразы кіраўнікоў (Апейка, Башлыкоў, Міканор, Дубадзел). Сучаснае прачытанне вобраза Апейкі.<br>4. Параўнальная характарыстыка вобразаў Васіля Дзятла і Халімона Глушака. Пераасэнсаванне вобраза кулака. | | 4 | | 1. ІЭВМК «Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя».<br>3. Тэксты твораў Івана Мележа. | [7]<br>[10]<br>[11]<br>[12] | Падрыхтоўка рэфератаў, тэсціраванне ў СДН Moodle. Рэйтынгавая кантрольная работа № 3. |
| | **Усяго ў VI семестры** | **36** | **36** | **48** | | | **Экзамен** |
| | **УСЯГО** | **60** | **60** | **108** | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Дасаева, Т. М. Беларуская літаратура ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя : вучэб. дапам. для студэнтаў установ выш. адукацыі / Т. М. Дасаева. – Мн. : Рэсп. ін-т выш. шк., 2016. – 264 с.

2. Заяц, Н. В. Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя : інтэрактыўны электрон. вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей: 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура, 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова / Н. В. Заяц // СДО Moodle / Белорус. гос. пед. ун-т. – URL: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2431 (дата звароту: 14.04.2025).

3. Макарэвіч, А. М. Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці ХХ ст. : дапаможнік : у 2 ч. / А. М. Макарэвіч. – Магілёў : Магілёўс. дзярж. ун-т, 2016. – Ч. 2. – 232 с.

**Дадатковая літаратура**

4. Аўтограф : альманах / Беларус. дзярж. арх.-музей літ. і мастацтва ; аўт. праекта Г. В. Запартыка ; навук. рэд. В. В. Жыбуль. – Мн. : Колоград, 2020– . – Вып. 1. – 2020. – 355 с.

5. Аўтограф : альманах / Беларус. дзярж. арх.-музей літ. і мастацтва ; аўт. праекта Г. В. Запартыка ; навук. рэд. В. В. Жыбуль. – Мн. : Колоград, 2020– . – Вып. 2. – 2021. – 370 с.

6. Аўтограф : альманах / Беларус. дзярж. арх.-музей літ. і мастацтва ; аўт. праекта Г. В. Запартыка ; навук. рэд. В. В. Жыбуль. – Мн. : БудМедыяПраект, 2020– . – Вып. 3. – 2022. – 288 с.

7. Гарадніцкі, Я. А. Беларуская літаратура другой паловы ХХ ст. (аўтары, жанры, стылі) / Я. А. Гарадніцкі ; НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. – Мн. : Беларус. навука, 2022. – 231 с.

8. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. ; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мн. : Беларус. навука, 1999–2015. – Т. 1 : 1901–1920. – 3-е выд. – 2003. – 583 с.

9. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. ; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мн. : Беларус. навука, 1999–2015. – Т. 2 : 1921–1941. – 2-е выд. – 2002. – 903 с.

10. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. ; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мн. : Беларус. навука, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1963. – 2-е выд. – 2002. – 952 с.

11. Гісторыя беларускай літаратуры : XX ст. (20–50-я гады) : падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / У. В. Гніламёдаў, В. В. Казлова, М. А. Лазарук [і інш.] ; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мн. : Выш. шк., 2000. – 511 с.
12. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. / рэдкал.: В. У. Ваніна (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : Беларус. Энцыкл., 2010– . – Т. 8 : Беларуская літаратура. – 2019. – 496 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ ХХ СТАГОДДЗЯ»

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў: развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры.

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў, дакладаў, прэзентацый; вядзенне чытацкага дзённіка; складанне тэстаў студэнтамі для арганізацыі ўзаемакантроля.

**Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў**

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1. | Рэферат | Прадукт самастойнай работы студэнта – кароткі выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе | Тэматыка рэфератаў |
| 2. | Паведамленне | Сродак, які спрыяе ацэнцы ўмення студэнта пісьмова выкладаць сутнасць вызначанай праблемы, рабіць высновы, якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пэўнай праблеме | Тэматыка паведамленняў |
| 3. | Даклад | Прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне з прэзентацыяй атрыманых вынікаў аналізу пэўнай тэмы ці праблемы | Тэматыка дакладаў |
| 4. | Мультымедыйная прэзентацыя | Прадстаўленне зместу вучэбнай задачы з выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій | Тэматыка прэзентацый |
| 5. | Чытацкі дзённік | Сродак, які выяўляе ўменні асэнсоўваць прачытаны матэрыял, вылучаць найбольш значныя кампаненты і абагульняць ідэі | Рэкамендацыі да вядзення чытацкага дзённіка |
| 6. | Камп’ютарны тэст | Сродак, які вымярае ўзровень ведаў і сфарміраванасці ўменняў студэнтаў вырашаць бягучыя задачы вучэбнага працэсу | СДН Moodle ttps://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2431 |
| 7. | Бібліяграфічны спіс | Прадукт самастойнай работы студэнта, які ўяўляе сабой спіс літаратуры па пэўнай тэме ці праблеме, неабходнай для яе вывучэння | Пералік тэм для складання бібліяграфічнага спіса |

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| **Гісторыя беларускай літаратуры 20–30-х гадоў ХХ стагоддзя** | | | | |
| 1. | 1.1. Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў. | 8 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты, запісаць іх тэзісы.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю «Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў». | Падрыхтоўка прэзентацый. |
| 2. | 1.2.1. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага. | 12 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты, запісаць іх тэзісы.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць пытанні для ўзаемаправеркі па тэмах:<br>1. Біяграфічныя звесткі. Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве.<br>2. Праблемна-тэматычнае і жанрава-стылявое наватарства прозы М. Гарэцкага. Тэма інтэлігенцыі і народа.<br>3. Зборнік прозы «Рунь» у кантэксце нацыянальнага эпасу пачатку ХХ стагоддзя.<br>4. Раманы «Віленскія камунары», | Падрыхтоўка чытацкіх дзённікаў, адказаў на пытанні, прэзентацый. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | «Камароўская хроніка»: гісторыя напісання, праблематыка, жанравая адметнасць.<br>5. Цыкл «Сібірскія абразкі».<br>6. Апошнія творы пісьменніка («Скарбы жыцця», «Лявоніус Задумекус», «Кіпарысы»).<br>7. М. Гарэцкі – крытык і літаратуразнаўца. «Гісторыя беларускае літаратуры».<br>Падрыхтаваць вусную прэзентацыю прапанаваных твораў пісьменніка. | |
| 3. | 1.3.1.1. Жыццёвы і творчы шлях Андрэя Мрыя. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Біяграфічныя звесткі. Адметнасць таленту А. Мрыя.<br>2. Апавяданні «ўзвышанскага» перыяду. Нетрадыцыйнасць герояў, асаблівасці мовы твораў.<br>3. «Запіскі Самсона Самасуя». Гісторыя публікацыі, прачытанне рамана ў 1920-я гады і ў наш час; асаблівасці формы, сувязь твора з надзённай рэчаіснасцю («культурная» рэвалюцыя, барацьба з пеэражыткамі мінулага і г.д.). Сутнасць жыццёвай філасофіі героя. | Падрыхтоўка вусных паведамленняў. |
| 4. | 1.3.2.1. Жыццёвы і творчы шлях Міхася Чарота. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх | Падрыхтоўка адказаў на пытанні, напісанне чытацкіх дзённікаў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць пытанні для ўзаемаправеркі па тэмах:<br>1. Месца М. Чарота ў літаратурным працэсе 1920-х гадоў. Вызначальныя рысы паэзіі.<br>2. Ліра-эпас пісьменніка. Паэма «Босыя на вогнішчы». Сімволіка вобразаў, розныя трактоўкі «босых».<br>3. Жанравая разнастайнасць прозы. Гуманістычны пафас твораў пра лёс прадстаўнікоў старога свету («Галя», «Талачка-шкрабалачка»). | |
| 5. | 1.3.3.1. Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Жылкі. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Самастойна пазнаёміцца з прапанаванымі творамі У. Жылкі, напісаць анатацыі на іх (у чытацкім дзённіку). | Падрыхтоўка анатацый (у чытацкім дзённіку). |
| 6. | 1.3.4.1. Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Дубоўкі. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Раннія зборнікі «Строма», «Трысцё», «Credo», іх мастацка-вобразная адметнасць.<br>2. У. Дубоўка і М. Багдановіч.<br>3. Уклад У. Дубоўкі ў развіццё паэмнага жанру («Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!»). | Падрыхтоўка вусных паведамленняў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7. | 1.3.5.1. Жыцёвы і творчы шлях Міхася Зарэцкага. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Прачытаць у «Гісторыі беларускай літаратуры» раздзел, прысвечаны творчасці М. Зарэцкага. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку). |
| 8. | 1.3.6.1. Жыцёвы і творчы шлях Язэпа Пушчы. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Пафас «маладнякоўскіх» зборнікаў «Раніца рыкае», «Vita».<br>2. Змена танальнасці ў кнігах «Дні вясны» і «Песні на руінах». Матывы і вобразы цыклаў «Асеннія песні», «Лісты да сабакі».<br>3. Задума стварэння паэмнай трылогіі і яе мастацкае ўвасабленне. Рэалістычны і сімвалічны планы прачытання паэм «Песня вайны», «Цень Консула». | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў. |
| 9. | 1.4. Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гадоў. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Прачытаць у «Гісторыі беларускай літаратуры» раздзел, прысвечаны літаратуры гэтага перыяду.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю «Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гадоў. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі». | Падрыхтоўка прэзентацый. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10. | 1.5.1. Літаратура Заходняй Беларусі | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю «Літаратура Заходняй Беларусі». | Падрыхтоўка прэзентацый. |
| | **Усяго ў V семестры** | **60** | | |
| **Гісторыя беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя** | | | | |
| 11. | 2.1. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты, запісаць іх тэзісы.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю «Літаратурна-грамадскі рух перыяду Вялікай Айчыннай вайны». | Падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН Moodle: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2431. |
| 12. | 2.2. Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1946–1956). | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Прачытаць у «Гісторыі беларускай літаратуры» раздзел, прысвечаны літаратуры гэтага перыяду.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю «Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі». | Падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 13. | 2.3.1. Жыццёвы і творчы шлях Кандрата Крапівы. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя выказванні па тэмах:<br>1. Біяграфічныя звесткі. Адметнасць таленту Кандрата Крапівы.<br>2. «Канфлікт – аснова п’есы».<br>3. Кандрат Крапіва – драматург. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў, тэсціраванне ў СДН Moodle. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 14. | 2.4.1. Жыццёвы і творчы шлях Міхася Лынькова. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць пытанні для ўзаемаправеркі па тэмах:<br>1. Месца М. Лынькова ў беларускай літаратуры.<br>2. Асэнсаванне трагедыі Вялікай Айчыннай вайны ў прозе М. Лынькова.<br>3. Жанравая разнастайнасць творчасці пісьменніка. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 15. | 2.5.1.Жыццёвы і творчы шлях Кузьмы Чорнага. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Самастойна пазнаёміцца з прапанаванымі творамі К. Чорнага, напісаць анатацыі на іх (у чытацкім дзённіку).<br>Падрыхтаваць прэзентацыю, прысвечаную творчасці К. Чорнага. | Падрыхтоўка прэзентацый, напісанне анатацый у чытацкім дзённіку, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 16. | 2.6.1. Жыццёвы і творчы шлях Петруся Броўкі. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Раннія зборнікі паэта, іх мастацка-вобразная адметнасць.<br>2. Творы П. Броўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.<br>3. Уклад П. Броўкі ў развіццё паэмнага жанру. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў, тэсціраванне ў СДН Moodle. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 17. | 2.7.1.Жыццёвы і творчы шлях Максіма Танка. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Прачытаць у «Гісторыі беларускай літаратуры» раздзел, прысвечаны творчасці М. Танка.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю, прысвечаную творчасці М. Танка. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 18. | 2.8.1. Жыццёвы і творчы шлях Аркадзя Куляшова. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Пафас ранніх вершаў паэта.<br>2. Зварот да філасофскага асэнсавання жыцця ў лірыцы.<br>3. Адметнасць паэтычнага эпасу А. Куляшова. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 19. | 2.9.1. Жыццёвы і творчы шлях Пімена Панчанкі. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Самастойна пазнаёміцца з прапанаванымі творамі П. Панчанкі, напісаць анатацыі на іх (у чытацкім дзённіку).<br>Падрыхтаваць прэзентацыю, прысвечаную творчасці П. Панчанкі. | Анатацыі да мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 20. | 2.10.1. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў, |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Месца Я. Брыля ў беларускай літаратуры.<br>2. Асэнсаванне тэм Заходняй Беларусі і Вялікай Айчыннай вайны ў прозе Я. Брыля.<br>3. Жанравая разнастайнасць творчасці пісьменніка. | тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 21. | 2.11.1. Жыццёвы і творчы шлях Андрэя Макаёнка. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Самастойна пазнаёміцца з прапанаванымі творамі А. Макаёнка, напісаць анатацыі на іх (у чытацкім дзённіку).<br>Падрыхтаваць прэзентацыю, прысвечаную творчасці А. Макаёнку. | Анатацыі да мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| 22. | 2.12.1. Жыццёвы і творчы шлях Івана Мележа. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных мастацкіх твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Самастойна пазнаёміцца з фільмам «Людзі на балоце» і напісаць рэцэнзію на яго.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Задума «Палескай хронікі» і яе ўвасабленне.<br>2. Параўнальная характарыстыка вобразаў Васіля Дзятла і Халімона Глушака. Пераасэнсаванне вобраза кулака. | Аналіз мастацкіх твораў (у чытацкім дзённіку), падрыхтоўка вусных паведамленняў, напісанне рэцэнзій, тэсціраванне ў СДН Moodle. |
| | **Усяго ў VI семестры** | **48** | | |
| | **Усяго па дысцыпліне** | **108** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– індывідуальная гутарка са студэнтамі для выяўлення якасці ведаў матэрыялу;

– франтальнае апытанне;

– вусная праверка атрыманых ведаў;

– праверка чытацкіх дзённікаў;

– праверка выкананых даследчых заданняў;

– ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных рэфератаў, паведамленняў і прэзентацый;

– тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2431.

Ацэнка за выкананне заданняў, рэфератаў, дакладаў уключае: правільнасць выканання задання; адпаведнасць і паўната раскрыцця тэмы; якасць выканання работы; самастойнасць меркаванняў; логіка падачы інфармацыі; афармленне.

**Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі і СР**

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Рэферат / паведамленне /даклад** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 3 заўвагі);<br>– тэма не раскрыта (4 і больш заўваг) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі);<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 3 заўвагі);<br>– аб’ём навуковай літаратуры недастатковы (4 і больш заўваг) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па двух пунктах з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па ўсіх пунктах |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (3 і больш заўваг);<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты не служаць мэтам абгрунавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў |
| **Мультымедыйная прызентацыя** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 3 заўвагі);<br>– тэма не раскрыта (4 і больш заўваг) |
| Падача матэрыялу (наяўнасць, дастатковасць і абгрунтаванасць графічнага афармлення: фотаздымкаў, відэаматэрыялаў, тэксту) | – падача матэрыялу поўнасцю адпавядае пазначаным параметрам;<br>– падача матэрыялу адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 2 заўвагі);<br>– падача матэрыялу адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 3 заўвагі);<br>– падача матэрыялу не адпавядае пазначаным параметрам (4 і больш заўваг) |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Чытацкі дзённік** | |
| Самастойнасць і асэнсаванасць занатаванага матэрыялу, | – прачытаны матэрыял асэнсаваны, назіранні і абагульненні самастойныя;<br>– прачытаны матэрыял слаба асэнсаваны, назіранні і абагульненні часткова самастойныя (не больш за 2 заўвагі);<br>– прачытаны матэрыял слаба асэнсаваны, назіранні і абагульненні часткова самастойныя (не больш за 3 заўвагі);<br>– прачытаны матэрыял не асэнсаваны, дзённік носіць кампелятыўны характар |
| Дастатковасць занатаванага матэрыялу | – колькасць прачытаных мастацкіх твораў і занатаванага матэрыялу дастатковая;<br>– колькасць прачытаных мастацкіх твораў і занатаванага матэрыялу недастатковая (не менш за 80%);<br>– колькасць прачытаных мастацкіх твораў і занатаванага матэрыялу недастатковая (50%);<br>– колькасць прачытаных мастацкіх твораў і занатаванага матэрыялу недастатковая (не менш за 30%);<br>– колькасць прачытаных мастацкіх твораў і занатаванага матэрыялу недастатковая (20 і меней адсоткаў) |
| **Бібліяграфічны спіс** | |
| Ступень раскрыцця | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| | – інфармацыя сапраўдная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПАВЕДАМЛЕННЯЎ І ДАКЛАДАЎ

1. Усебеларускае аб’яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк»: агульная характарыстыка.
2. Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша»: агульная характарыстыка.
3. Вобразы і матывы паэзіі Уладзіміра Жылкі.
4. Ідэйна-сэнсавы змест паэмы Язэпа Пушчы «Песня вайны».
5. Віктар Яроцкі і Адам Барковіч – персанажы мефістофілеўскага тыпу.
6. Любоўныя трохкутнікі ў апавяданнях Міхася Зарэцкага.
7. Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў заходнебеларускай паэзіі 1930-х гадоў.
8. Балада ў творчасці Петруся Броўкі.
9. Наватарства п’ес Андрэя Макаёнка.
10. «Касмічныя» вершы Аркадзя Куляшова. Філасафічнасць як адметная рыса таленту паэта.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ

1. Творчая індывідуальнасць Максіма Гарэцкага.
2. Кандрат Крапіва супраць тэорыі бесканфліктнасці (на матэрыяле артыкулаў і п’ес).
3. Публіцыстычная плынь у паэзіі Вялікай Айчыннай вайны.
4. Проза Міхася Зарэцкага: гуманістычны пафас, навізна праблематыкі, мастацкія асаблівасці твораў.
5. Падзеі калектывізацыі ва ўзнаўленні М. Зарэцкім (на матэрыяле рамана «Вязьмо»).
6. Мастацка-вобразны свет паэзіі Язэпа Пушчы «ўзвышанскага» перыяду (цыклы «Асеннія песні», «Лісты да сабакі»).
7. Асаблівасці літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі.
8. «Брама неўміручасці» Кандрата Крапівы ў сістэме твораў на тэму змагання чалавека са смерцю.
9. «Давераснёўскі» этап творчасці Максіма Танка.
10. Праблемна-тэматычны дыяпазон лірыкі Аркадзя Куляшова.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПРЭЗЕНТАЦЫЙ

1. Усебеларускае аб’яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк» у асобах.
2. Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша» ў асобах.
3. Праблемна-тэматычны дыяпазон творчасці Міхася Зарэцкага.
4. Літаратурны працэс Заходняй Беларусі: тэмы, матывы, творцы.

5. Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
6. Кандрат Крапіва-байкапісец: аб’екты сатырычнага высмейвання, алегарычныя вобразы-тыпы ў творах.
7. Сатырычная камедыя Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім» у кінематаграфічным і тэатральным увасабленні.
8. Вобразы «апошніх з людзей» у рамане Кузьмы Чорнага «Млечны шлях».
9. Паэма-рэквіем Петруся Броўкі «Голас сэрца».
10. Янка Брыль-апавядальнік.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ДА ВЯДЗЕННЯ ЧЫТАЦКАГА ДЗЁННІКА

Матэрыялы чытацкага дзённіка павінны ўтрымліваць пераказ мастацкіх твораў з аналітычнай падборкай цытат. Кожная цытата каменціруецца, або цытаты групіруюцца па кампанентах аналізу, які ілюструе тэматыку, праблематыку тэксту, ідэйную аснову, асаблівасці мовы і г.д.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ДЛЯ СКЛАДАННЯ БІБЛІЯГРАФІІ

1. Жаночыя вобразы ў апавяданнях Міхася Зарэцкага.
2. Месца сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім» у творчай спадчыне Кандрата Крапівы.
3. «Малая» проза Міхася Лынькова ваеннага часу. Вобразы дзяцей у творах.
4. Раман Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні» як філасофскі твор.
5. Тэма мастака і мастацтва ў паэме Максіма Танка «Люцыян Таполя».
6. Раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды»: сюжэтна-кампазіцыйныя і жанрава-стылявыя асаблівасці.
7. Праблема ўкрадзенага маленства ў творах Кузьмы Чорнага і Міхася Лынькова.
8. Лірыка Пімена Панчанкі: водгук на маральныя, экалагічныя, сацыяльныя, нацыянальныя праблемы ў вершах.
9. Верлібр у творчасці Максіма Танка.
10. Жаночыя вобразы ў «Палескай хроніцы» Івана Мележа.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ (V СЕМЕСТР)

1. Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў. Актывізацыя культурна-грамадскага жыцця. Палітыка беларусізацыі, яе плённае ўздзеянне на агульны стан нацыянальнай культуры.
2. Стварэнне літаратурных арганізацый. Ідэйна-эстэтычная праграма аб'яднання «Маладняк».
3. Стварэнне літаратурных арганізацый. Ідэйна-эстэтычная праграма аб'яднання «Узвышша».
4. Стварэнне літаратурных арганізацый. Ідэйна-эстэтычная праграма аб'яднання «Полымя».
5. Цэнтралізацыя літаратурнага жыцця Беларусі: стварэнне БелАПП, Саюза пісьменнікаў БССР.
6. Лёс і творчасць Максіма Гарэцкага. Праблемна-тэматычнае і жанрава-стылявое наватарства прозы Максіма Гарэцкага.
7. Першая сусветная вайна ў лёсе і творчасці Максіма Гарэцкага. Гуманістычны пафас твораў «На імперыялістычнай вайне», «Літоўскі хутарок», «Рускі» і інш.
8. Аповесць Максіма Гарэцкага «Дзве душы». Духоўныя пошукі Абдзіраловіча. Вобразы бальшавікоў у творы.
9. Шлях героя-інтэлігента да народа (на прыкладзе твораў Максіма Гарэцкага «У лазні», «Роднае карэнне», «У чым яго крыўда?»). Драматызм духоўных пошукаў герояў пісьменніка.
10. Зварот да мінулага ў апавяданнях Максіма Гарэцкага «Панская сучка», «Страшная музыкава песня», «Смачны заяц» і інш.
11. Філасофская праблематыка аповесцей «У чым яго крыўда?» і «Меланхолія». Характар светаадчування, духоўныя пошукі Лявона Задумы. Асаблівасці кампазіцыі.
12. Жыццё беларускай вёскі ў аповесці «Ціхая плынь». Тыповасць лёсу галоўнага героя. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў творы.
13. Паслярэвалюцыйныя падзеі ў адлюстраванні М. Гарэцкім (аповесць «Дзве душы»). Інтэлігент Абдзіраловіч і яго пазіцыя. Вобразы прадстаўнікоў розных грамадска-палітычных арыентацый.
14. Гуманістычная пазіцыя М. Гарэцкага. Творы класіка беларускай літаратуры і пісьменнікаў «страчанага пакалення».
15. Месца і роля М. Гарэцкага ў нацыянальным прыгожым пісьменстве. М. Гарэцкі – крытык і літаратуразнаўца. «Гісторыя беларускае літаратуры»: лёс кнігі, ацэнкі сучасных даследчыкаў.
16. Літаратурныя аб'яднанні 1920-х гг. на Беларусі. Ідэйна-эстэтычныя праграмы «Маладняка», «Узвышша», «Полымя». Агульная характарыстыка творчасці маладнякоўцаў і ўзвышанцаў. Іх лёс у 1930-я гг.

17. Жыццёвы шлях і праблемна-тэматычная, жанрава-стылявая шматстайнасць творчасці Міхася Чарота. Вобраз рэвалюцыі ў зборніку «Завіруха». Аналіз вершаў на выбар.

18. Паэма Міхася Чарота «Босыя на вогнішчы» як твор новай пралетарскай літаратуры.

19. П’есы для дзяцей М. Чарота. Драма «На Купалле». Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча і Я. Купалы ў камедыі-вадэвілі «Мікітаў лапаць».

20. Традыцыі сатырычнай прозы ў беларускай літаратуры. Творчая асоба Андрэя Мрыя. Малая проза пісьменніка (аналіз апавяданняў «Камандзір», «Рабін» і інш.).

21. Гратэскава-камічны свет персанажаў у рамане «Запіскі Самсона Самасуя» Андрэя Мрыя.

22. Раман А. Мрыя ў кантэксце сатырычнай прозы 1920–1930-х гг. (творы К. Крапівы, М. Булгакава, М. Зошчанкі, І. Ільфа і Я. Пятрова, А. Платонава, Я. Гашака).

23. Жыццёвы шлях Уладзіміра Жылкі. Гістарычны лёс Беларусі, незалежніцкія і адраджэнскія матывы ў творах пісьменніка. Аналіз вершаў на выбар.

24. Праблемна-тэматычная, жанрава-стылявая шматстайнасць творчасці Уладзіміра Дубоўкі. Аналіз вершаў на выбар.

25. Міні-паэма У. Жылкі «Тэстамент» – споведзь і запавет паэта наступным пакаленням. Вобраз аўтара ў творы.

26. Раннія зборнікі У. Дубоўкі «Строма», «Трысцё», «Credo», іх мастацка-вобразная адметнасць. Выявы «маладнякоўскай бурапеннасці». Стаўленне Дубоўкі-маладнякоўца да класічнай спадчыны.

27. «Узвышанскі» перыяд творчасці Уладзіміра Дубоўкі. Тэма мастака і мастацтва ў паэтычнай трылогіі Уладзіміра Дубоўкі «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!» (аналіз адной паэмы на выбар).

28. Навізна праблематыкі першых вялікіх эпічных твораў («Голы звер», «Сцежкі-дарожкі»), сюжэтна-кампазіцыйнае майстэрства празаіка.

29. Гуманістычны пафас, навізна праблематыкі, мастацкія асаблівасці «малой прозы» Міхася Зарэцкага (апавяданні «Ворагі», «Кветка пажоўклая», «Двое Жвіроўскіх» і інш.).

30. Вобраз жанчыны «новага часу» ў прозе Міхася Зарэцкага (на прыкладзе апавяданняў «Дзіўная», «Бель» і інш.).

31. Падзеі калектывізацыі ў рамане «Вязьмо» Міхася Зарэцкага. Віна і бяда Сымона Карызны. Вобразы Пацяроба, Рачкоўскага, Зеленюка, іх роля ў творы. Сімвалічны змест назвы рамана.

32. Багацце і разнастайнасць чалавечых характараў у рамане «Вязьмо» Міхася Зарэцкага. Вобраз Галілея і яго ідэйна-кампазіцыйная роля. Галілей і Плакс як філосафы. Вобраз Якуба Лакоты-летуценніка.

33. Пафас «маладнякоўскіх» зборнікаў Язэпа Пушчы. Імажынісцкае светабачанне паэта. Аналіз вершаў на выбар.

34. Рэалістычны і сімвалічны планы прачытання паэм Язэпа Пушчы «Песня вайны», «Цень Консула», «Сады вятроў». Тэма мастака і мастацтва ў творах.

35. «Узвышаўская» паэзія Язэпа Пушчы. Гістарычны лёс Бацькаўшчыны і яго алегарычнае ўвасабленне ў «Лістах да сабакі».

36. Літаратурна-грамадскае жыццё 1930-х гадоў. Развіццё прозы, паэзіі, драматургіі.

37. Літаратура Заходняй Беларусі. Мінск і Вільня як два культурныя цэнтры Беларусі. Перадумовы і прычыны гэтага. Папулярнасць ідэі аб’яднання ў абедзвюх частках краіны.

38. Неаднароднасць літаратурнага працэсу Заходняй Беларусі. Пашырэнне масавай паэзіі, літаратуры факта.

39. Творчасць пісьменнікаў розных культурна-мастацкіх і ідэйных арыентацый, аб’яднаных ідэяй служэння Радзіме (З. Верас, К. Сваяка, Х. Ільяшэвіча, А. Салагуба, М. Васілька, М. Машары, П. Пестрака і інш.).

40. Вызваленча-рэвалюцыйная тэма ў паэзіі 1930-х гадоў (творчасць М. Танка, М. Машары, М. Засіма, В. Таўлая і інш.).

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ (VI СЕМЕСТР)

1. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны: агульная характарыстыка.
2. Жанрава-тэматычная і вобразная разнастайнасць паэзіі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
3. Жанрава-тэматычная і вобразная разнастайнасць прозы перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
4. Агульная характарыстыка літаратурнага працэсу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.
5. Жанрава-тэматычная і вобразная разнастайнасць паэзіі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.
6. Жанрава-тэматычная і вобразная разнастайнасць прозы першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.
7. Кандрат Крапіва – байкапісец. Праблематыка, героі баек, традыцыі народнай смехавой культуры ў творах (аналіз 4–5-ці баек на выбар).
8. Канкрэтна-гістарычная эпоха і носьбіты яе маралі ў камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Маштабнасць сатырычных характараў у творы. Сацыяльная абумоўленасць паводзін Тулягі. Станоўчыя героі п’есы.
9. Вобразы прыстасаванцаў у камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Носьбіты духоўнай маралі ў творы.
10. Нетрадыцыйны паказ ваеннай рэчаіснасці ў сатырычнай камедыі «Мілы чалавек» Кандрата Крапівы. Праўдзівасць і жыццёвасць вобраза Жлукты-Чарскага. Мяшчанскае асяроддзе ў творы.
11. Філасофскі роздум Кандрата Крапівы над праблемамі быцця ў фантастычнай камедыі «Брама неўміручасці». Сатырычныя вобразы-тыпы (Дажывалаў, Караўкін, Торгала, Застрамілава, Банкір і інш.) як асуджэнне бездухоўнасці і прымітывізму. Функцыя станоўчых персанажаў у творы.
12. Адметнасць стылявой манеры Міхася Лынькова. Паказ у ранніх творах (апавяданні «Над Бугам», «Маньчжур», «Баян» і інш.) нараджэння новага чалавека. Тэма Заходняй Беларусі ў творчасці пісьменніка (апавяданне «Сустрэчы»).
13. Малая проза Міхася Лынькова ваеннага часу (зборнік «Астап»). Вобразы дзяцей у творах («Васількі», «Салют» і інш.).
14. Асаблівасці апавяданняў Кузьмы Чорнага «маладнякоўскага» і «ўзвышанскага» перыядаў (аналіз апавяданняў «Радасць жанчыны», «Маленькая жанчына», «На пыльнай дарозе», «Вераснёвыя ночы» і інш.).
15. Вобраз уласніка ў аповесці Кузьмы Чорнага «Лявон Бушмар».
16. Гісторыя напісання, кампазіцыя, праблематыка, вобразная сістэма рамана Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні». Сімволіка ў творы.
17. Будучыня вачыма герояў рамана Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні».

18. «Млечны шлях» Кузьмы Чорнага як філасофскі раман. Асэнсаванне сутнасці і вытокаў фашызму.

19. Лёс беларускага народа ў рамане Кузьмы Чорнага «Млечны шлях». Вобразы Мікалая Сямагіна і Уладзіміра Ярмаліцкага. Праблема маральнага выбару.

20. Асаблівасці стылю К. Чорнага. Творчае крэда пісьменніка – «Чалавек – гэта цэлы свет».

21. «Ваенны» перыяд у творчасці Петруся Броўкі. Зварот паэта да фальклорных сродкаў (аналіз вершаў «Байцам-беларусам», «Рана», «Надзя-Надзейка», «Кастусь Каліноўскі» і інш.).

22. Лірыка Петруся Броўкі 1950 – 1970-х гг. (аналіз вершаў «Пахне чабор», «Як ліст дубовы», «Калі надыдзе час спачыну», «Споведзь», «Усё жыццё – адно імгненне» і інш.).

23. Дывераснёўскі этап у творчасці Максіма Танка. Жанрава-тэматычная разнастайнасць паэтычных зборнікаў «На этапах», «Журавінавы цвет», «Пад мачтай» (аналіз вершаў «Спатканне», «Песня кулікоў», «На пероне», «Паслухайце, вясна ідзе» і інш.).

24. Творчасць Максіма Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны (аналіз вершаў «Вастрыце зброю», «Родная мова», «Маці» і інш.). Праблематыка паэмы «Янук Сяліба».

25. Тэмы, матывы лірыкі Максіма Танка 1960 – 1970-х гг. (аналіз вершаў «Ave Maria», «Готыка “Святой Ганны”», «Жанчына», «Рукі маці», «Перапіска з зямлёй», «Расшытае крыжыкамі», «Мой каўчэг» і інш.).

26. Верлібр і цвёрдыя вершаваныя формы ў творчасці Максіма Танка. Верш на памяць.

27. Шматстайнасць ліра-эпасу Максіма Танка. Аналіз героіка-рамантычнай паэмы «Нарач». Вобразы народных абаронцаў.

28. Мастацкія пошукі Аркадзя Куляшова ў перадваеннае дзесяцігоддзе (аналіз вершаў «Бывай…», «Маладосць», «Карусель», «Мая Бесядзь» і інш.).

29. Творчасць Аркадзя Куляшова перыяду Вялікай Айчыннай вайны (аналіз вершаў «Над брацкай магілай», «Ліст з палону», «Балада аб чатырох заложніках» і інш.).

30. Сюжэтна-кампазіцыйнае наватарства паэмы Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады». Праблематыка, вобразная сістэма твора.

31. Агульная характарыстыка лірыкі Аркадзя Куляшова 1950 – 1970-х гг. (аналіз вершаў «Элегія», «Я хаце абавязаны прапіскаю», «Ёсць у паэта свой аблог цалінны», «Сама зямля не вечна – час даводзіць…», «Адвечны час з нябачных нам дарог», «Сасна і бяроза», «Адзіны серп на сённяшнім жніве» і інш.). Верш на памяць.

32. Філасофскі роздум над лёсам зямлі ў паэме Аркадзя Куляшова «Цунамі».

33. Творчая эвалюцыя Пімена Панчанкі. Пафас, матывы, вобразы ў творах паэта 1930-х гг. Аналіз вершаў «Упэўненасць», «Радзіме», «Моладзі», «Заўтра». Адметнасць мастацкага голасу паэта.

34. Шматаспектнасць лірыкі Пімена Панчанкі ваеннага часу. Аналіз вершаў «Кожны з нас прыпасае Радзімы куток», «Сінія касачы», «Герой», «Маё і тваё маленства», «Сустрэча з бярозай» і інш.

35. Пімен Панчанка і сучаснасць. Аналіз вершаў «Іх вечныя агні», «Лясы і рэкі», «Сармацкае кадзіла», «Той дзень прапаў і страчаны навекі», «Беларуская мова», «Ратуйце нашы душы!» і інш.

36. Янка Брыль-апавядальнік. Узаемадзеянне лірычнага і эпічнага пачаткаў у творах. Аналіз апавяданняў «Марыля», «Галя», «Праведнікі і зладзеі».

37. Праблематыка твораў Янкі Брыля на тэму Вялікай Айчыннай вайны: «Маці», «Дваццаць», «Memento mori».

38. Творчая гісторыя рамана «Птушкі і гнёзды». Жанрава-стылявыя асаблівасці, аўтабіяграфізм твора. Паказ духоўнага сталення Алеся Руневіча.

39. Праблемна-тэматычнае, жанравае наватарства драматургіі Андрэя Макаёнка 1960-х – пач. 1980-х гг. Аналіз п'есы «Выбачайце, калі ласка».

40. Ідэйная накіраванасць трагікамедыі Андрэя Макаёнка «Зацюканы апостал». Абагуленасць персанажаў твора.

41. Жанрава-стылявое наватарства п'есы Андрэя Макаёнка «Трыбунал». Сістэма вобразаў у творы.

42. Спецыфіка сатыры А. Макаёнка – «смех праз слёзы». Сучаснае прачытанне п'ес «Трыбунал», «Зацюканы апостал».

43. Станаўленне творчай індывідуальнасці Івана Мележа. Мастацкія асаблівасці, тэматыка і праблематыка ранніх твораў пісьменніка (аналіз апавяданняў «У завіруху», «У гарах дажджы», «Спатканне за горадам»).

44. Задума цыкла «Палеская хроніка». Асноўныя праблемы і канфлікты ў раманнай трылогіі Івана Мележа. Сімволіка загалоўкаў.

45. Параўнальная характарыстыка вобразаў Васіля Дзятла і Міканора (па раманах Івана Мележа «Людзі на балоце», «Подых навальніцы»).

46. Параўнальная характарыстыка вобразаў Ганны Чарнушкі і Хадоські (па раманах Івана Мележа «Людзі на балоце», «Подых навальніцы»).

47. «Палеская хроніка» Івана Мележа ў кантэксце літаратуры пра калектывізацыю. Новае ў падыходзе празаіка да паказу селяніна.

48. Сюжэтныя лініі Халімона Глушака, Васіля Дзятла ў накідах да няскончаных раманаў.

49. Вобразы кіраўнікоў у «Палескай хроніцы» Івана Мележа (Апейка, Башлыкоў, Міканор, Дубадзел і інш.).

50. Псіхалагічнае майстэрства Івана Мележа. Асаблівасці стылю празаіка.

# ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

## V СЕМЕСТР

1. Якімі паўстаюць інтэлігенты ў апавяданнях Максіма Гарэцкага, параўнайце іх вобразы з вобразамі настаўнікаў у творах Якуба Коласа. Якім Вам бачыцца ідэал настаўніка, сваю думку абгрунтуйце.

2. Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Антываенны пафас апавяданняў Максіма Гарэцкага».

3. Прачытайце верш Уладзіміра Жылкі. Вызначце яго тэму, ідэю. У які перыяд творчасці паэт стаў звяртацца да гэтай тэмы?

О Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цвет!
У ветры дзікім не загінеш,
чарнобылем не зарасцеш.

Пялёсткамі тваімі стану,
на дзіды сэрца накалю.
Тваіх вачэй - пад колер сталі -
праменне яснае люблю.

Ніколі пройме з дзікім ветрам
не развіваць дзявочых кос.
Імкнешся да Камуны Свету,
каб радасць красавала скрозь.

Варожасць шляху не зачыніць:
у перашкодах дух расце.
О Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цвет!

4. У якім творы Міхася Зарэцкага дзейнічаюць наступныя персанажы? Растлумачце сутнасць канфлікту твора, адзначце праблемнае і жанравае наватарства ў раскрыцці тэмы.

Карызна
Пацяроб
Рачкоўскі
Зеленюк

Галілей
Плакс
Якуб Лакота

## VI СЕМЕСТР

1. Прачытайце верш Пімена Панчанкі «Герой». Пракаменціруйце выказванне Васіля Быкава пра гэты твор: «Думаецца, калі б ён пра фронт не напісаў болей нічога, дык адных гэтых радкоў хапіла, каб з такой яркай канкрэтнасцю выказаць усю пакутніцка-гераічную сутнасць мінулай вайны». Што зближае верш Пімена Панчанкі з ваеннымі аповесцямі Васіля Быкава?

ГЕРОЙ
Злосна сказаў: «Уставай, пяхота!
Мы не на пляжы, а на вайне».
І лёг на змяіныя скруткі дроту.
І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне.

Не ён, а другія ішлі ў атаку,
Гранаты кідалі ў бліндажы,
Калолі фрыцаў, палілі танкі
І сцяг перамогі ўзнімалі ранкам
На заваёваным рубяжы.

А ён свае косці з іржавых калючак
Сваімі рукамі без стогну аддзёр,
Зваліўся на травы, і стала балюча
І тавам, і росам, і ветрам гаючым,
Што прыляцелі з валдайскіх азёр.

2. Прачытайце ўрывак з верша Пімена Панчанкі. Якую сэнсавую нагрузку мае вобраз сініх касачоў? Успомніце іншыя вершы паэта, напісаныя ў час Вялікай Айчыннай вайны. Чым яны вылучаюцца з пашыранай у той перыяд публіцыстычнай плыні?

СІНІЯ КАСАЧЫ
А калісьці і я прачынаўся ў бацькавай хаце.
Чэрвень. Раніца. Росы і цішыня.
На гародзе спявае паціху маці
Пра маладога жаўнера, пра гнядога каня.

<…>

Не паспелі у шчасці як след пакупацца мы, –
Бомбы свіснулі, пырснула першая кроў.
Хата вочы закрыла дашчанымі пальцамі,
Каб не бачыць гора гаспадароў.

Прашаптала матуля на ростані: «Лёс такі!..»
І прыніклі журботна да градак пялёсткамі
Сінія касачы.

Пяць франтоў мяне пылам гарачым абсыпалі,
За вайну перамерана тысячы вёрст.
З успамінамі крочыў над ветрамі сіплымі
І з надзеяй на студзеньскім холадзе мёрз.

І заўсёды здалёк, праз прасторы вялікія
Усміхаліся мне і дамоў мяне клікалі
Сінія касачы.

Нехта бруднымі ботамі, пэўна, іх вытаптаў,
Выбіў градкі, спаліў невысокі паркан.
І не мае аздобы зямля працавітая,
І сумуе па кветках маўклівы туман.

Прыйдзе час – зноў збудуем мы хаты утульныя,
А цяпер – біць дык біць! І за слёзы матуліны,
І за сінія касачы.

3. Прачытайце ўрывак з апавядання Кузьмы Чорнага «Маленькая жанчына». Растлумачце, якім чынам у творы раскрываецца тэма «ўкрадзенага маленства». Назавіце іншыя творы беларускіх пісьменнікаў на гэту тэму.

Яны ішлі ляснымі сцежкамі і глухімі закуткамі. Ішлі з дзецьмі. Меншых неслі на руках. Яны былі маўклівыя. У гэтай маўклівасці было адзінае для ўсіх іх пачуццё – вялікае і наймацнейшае за ўсё, што асталося цяпер у іх жыцці. Гэта была нянавісць, і ёй не было ні канца, ні меры.

Найбольш гэта былі жанчыны. Былі маладыя, былі і сярэдніх год, былі і старыя, але ішла сярод іх адна «жанчына» са «сваімі дзецьмі», у якой адной з'ядналася ўсё, што было напісана на многіх тварах, што жыло ў многіх душах. Гэтай «жанчыне» было год дванаццаць, і вяла яна з сабой двое дзяцей. Большаму

хлопчыку было год сем, меншай дзяўчынцы – год пяць. Гэтую дзяўчынку яна нават разоў са два спрабавала падносіць на руках. Было гэта паблізу і раўналежна дарозе з Менска на Маскву.

4. Прачытайце верш. Вызначце аўтара, тэму, ідэю. У якім з буйных твораў гэтага паэта таксама згадваецца гісторыя кахання да дзяўчыны Алесі?

БЫВАЙ...
Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець.
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..
Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.
Назаўтра золкае, туманнае світанне,
Суровы позірк твой і мой нямы адчай.

Пайшла ты, любая, пад гоман жоўтых сосен,
Пайшла, маўклівая, пад хваль жытнёвых шум,
Туды, дзе гойдала зялёнае калоссе
На сцежках ростані мой адзінокі сум.

Пайшла за ціхія, далёкія прасторы
Світальнай зоркай ты, што гасне ў сіняве.
Душы пакрыўджанай гарачыя дакоры
Слязой халоднаю застылі на траве.

Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманны,
Палынны жаль смугой ахутаных дарог,
Каб я хвілінны боль і горыч гэтай раны
Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не мог.

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.

Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая.
Твой светлы вобраз панясу я па жыцці.
На ўсходзе дня майго заранка дагарае,

Каб позна вечарам на захадзе ўзысці.

5. У якой з п’ес Андрэя Макаёнка дзейнічаюць наступныя персанажы? Растлумачце сутнасць канфлікту п’есы, адзначце праблемнае і жанравае наватарства ў раскрыцці тэмы.

Цярэшка Калабок.
Паліна.
Галя.
Зіна.
Надзея.
Валодзька.
Сырадоеў.
Камендант.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПА ДЗЕСЯЦІБАЛЬНАЙ ШКАЛЕ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***10 (дзесяць) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;<br>творчая самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***9 (дзевяць) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |

| | | |
|---|---|---|
| 3. | ***8 (восем) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 4. | ***7 (сем) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях, напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць іх аналітычную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 5. | ***6 (шэсць) балаў, залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, |

| | | |
|---|---|---|
| | | уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 6. | ***5 (пяць) балаў, залічана*** | дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў |
| 7. | ***4 (чатыры) балы, залічана*** | дастатковы аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны адказ на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыповыя) задачы;<br>уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім ацэнку;<br>работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, |

| | | |
|---|---|---|
| | | лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў |
| 8. | ***3 (тры) балы, не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 9. | ***2 (два) балы, не залічана*** | фрагментарныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, модуля, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 10. | ***1 (адзін) бал, не залічана*** | адсутнасць ведаў і кампетэнцый у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні манаграфічных тэм надаваць больш увагі вывучэнню вершаваных жанраў літаратуры. | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |
| «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы ХІХ – ХХ стагоддзяў» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гадоў» праводзіць аналогіі з Нашаніўскім перыядам | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |
| «Беларуская дзіцячая літаратура» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні манаграфічных тэм па гісторыі літаратуры 20–30-х гадоў ХХ стагоддзя абапірацца на веды, атрыманыя на занятках па «Беларускай дзіцячай літаратуры» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |
| «Вусная народная творчасць» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні аглядавых і манаграфічных тэм абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Вуснай народнай творчасці». | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |